

НЕДАРАГІ ДАРАГІ БРЫКЕТ 6

САМАЕ ЦІКАВАЕ Ў СВЕЦЕ — КНІГІ 16

XXIX МІНСКАЯ МІЖНАРОДНАЯ КНІЖНАЯ ВЫСТАВА-КІРМАШ

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 САКАВІКА 2022 г. СУБОТА № 59 (29681)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі:**

*«У цэлым перад усімі намі стаіць вялікая і адказная задача — актыўна ўключыцца ў маштабнае перафарміраванне прававой сістэмы Беларусі з улікам прынятых змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Для гэтага неабходна выкарыстоўваць увесь назапашаны шматгадовы вопыт у нарматворчай дзейнасці, вынікі навуковых даследаванняў у галіне права, найлепшыя замежныя практыкі ў сферы нарматворчасці. Нам трэба працаваць як ніколі хутка, дакладна і высокапрафесійна. Думаць трэба аналітычна. З улікам значнага аб'ёму, складанасці і важнасці работы і часовага люфту, які ў нас ёсць, па-іншаму нельга».*

# Вясна лыжам не перашкода



Нягледзячы на сонечныя дзянькі, якія радавалі нас на працягу двух апошніх тыдняў, лыжаролерная траса ў сталічнай Вяснянцы не пустуе і па-ранейшаму прыдатная для лыжных прагулак і трэніровак прафесійных спартсменаў. Мяне ў гэтым пераканала сустрэча з бадзёрай лыжніцай — студэнткай Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізкультуры Дар'яй МАЛЧАНАВАЙ. Лыжніца хутка мчалася па снегавым серпанціне, пераадольваючы крутыя пад'ёмы на чарговым крузе.

— Я імкнуся кожны дзень станавіцца на лыжы, прабягаць па пятнаццаць-сямнаццаць кіламетраў. Шкада, што сонейка і плюсавая тэмпература робяць сваю «нядобрую» для нас, лыжнікаў, справу.

Дзяўчына родам з Барысава, у дзяцінстве займалася ў спартыўнай школе, выступала ў лыжных гонках рознага ўзроўню, цяпер вучыцца на факультэце масавых відаў спорту. Дар'я — на апошнім курсе, у хуткім часе атрымае дыплом і адправіцца на малую радзіму вучыць падлеткаў у сваёй школе, дзе сама выхоўвалася і заваёўвала свае першыя ўзнагароды.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Беспрацоўным у Брэсце прапануюць навучанне па васьмі запатрабаваных прафесіях.**
- «Аблічча горада» ў жывапісе і графіцы прадставяць на выставе ў Гродне.
- **Чырвоны Крыж адправіў з Віцебска гуманітарны груз для бежанцаў з Украіны.**
- Маладзёжнае першынство Беларусі па шашках стартуе ў Гомелі.
- **Мінтранс увёў сезонныя абмежаванні нагрузак на рэспубліканскіх дарогах.**

ISSN 1990 — 763X

Спажывец

# ЧЫСТА ВЯСНОВЫ ЛАСУНАК

**Бярозавік можна смела назваць адным з сімвалаў вясны ў нашых шыротах. Ці карысны гэты прадукт і ці не шкодзіць дрэвам яго нарыхтоўка? Давайце разбяромся...**



**Сезон збору бярозавага ласунку пакуль стартаваў толькі ў асобных рэгіёнах Брэсцкай вобласці, распавялі ў прэс-службе Міністэрства лясной гаспадаркі. Масавы збор соку ў лясах Беларусі пачнецца бліжэй да канца наступнага тыдня. Як адзначае прэс-сакратар Мінлясгаса Анастасія МАЦКЕВІЧ, пакуль руху соку перашкаджаюць начныя замаразкі: для збору бярозавіку неабходна, каб ноччу тэмпература паветра не апускалася ніжэй за нуль, а днём дасягала пяці-шасці градусаў.**

СТАР. 12

Здароўе на талерцы

# ВІТАМІНЫ, ІМБІР, КУРКУМІН...

**Што насамрэч дапамагае засцерагчыся і вылечыцца ад каранавіруса?**

**Якая сувязь існуе паміж харчаваннем і COVID-19? Ці можа пэўная дыета засцерагчы нас ад каранавіруса? Наколькі важнае здаровае харчаванне для падтрымання імуннай сістэмы? Усе гэтыя пытанні ўзнімаліся падчас Міжведамаснага каардынацыйнага савета па праблемах харчавання пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.**

СТАР. 5



З першых вуснаў

# «ГЭТА ПОЎНАМАШТАБНАЯ ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ВАЙНА — ЗА РОЗУМ НАШЫХ ЛЮДЗЕЙ, ЗА БУДУЧЫНЮ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ. І ПРАЙГРАЦЬ МЫ ПРОСТА НЕ МОЖАМ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду аб пытаннях дзейнасці сродкаў масавай інфармацыі. На парадку дня — самыя праблемныя пытанні СМІ, сярод якіх работа падчас інфармацыйнай вайны, пытанні рэкламы, кадравы патэнцыял.**

«Як бы ні было цяжка, вы павінны не толькі ўтрымліваць фокус увагі аўдыторыі, адукоўваць, тлумачыць, падтрымліваць, але і думаць аб уласным развіцці. Мы не павінны апусціць рукі — урок 2020 года, калі нам здавалася, што ўсё добра. А не. Таму трэба працаваць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

На парадку дня таксама і праект указа, які рэгулюе пытанні рэкламы ў сродках масавай інфармацыі. Урад, Адміністрацыя Прэзідэнта разглядалі гэтае пытанне некалькі разоў з розных бакоў. Цяпер дакумент знаходзіцца ў кіраўніка дзяржавы.

«Мы ўвялі ў дзеянне айчынную сістэму медыявымярэння, якая павінна забяспечыць празрыстасць рынку і рэйтынгаў тэлеканалаў і радыёстанцый у нашай краіне, затым стварылі рэестр рэкламных распаўсюджвальнікаў. Сёння сітуацыя памянялася кардынальна. У выніку цяперашняга геапалітычнага канфлікту на Расію, а заадно і на Беларусь абрынулі новы шквал рабаўнічых санкцый», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Прэзідэнт пацікавіўся, ці ёсць рэальныя інструменты падтрымкі СМІ ў сітуацыі, якая склалася.

## Трэба прапагандаваць усё найлепшае

Асобна кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на негатыўнае адценне слова «прапаганда», якая заўсёды прысутнічае ў медыя. Па яго словах, пра гэта не трэба турбавацца і прапагандаваць не фэйкі, а праўду. ***«Мы ва ўнікальнай сітуацыі. Адзіная з усіх цывілізаваных краін, якая прыстойна выглядае. Мы не хлусім, мы не перабольшваем нічога. У нас дастаткова фактаў, дастаткова інфанагод, каб іх паднесці сусветнай грамадскасці, не толькі нашай публіцы. Але так і трэба прапагандаваць. Чаго мы баімся? Не ведаю, чаму абылгалі і апаганілі гэтае слова. Заўсёды была, ёсць і будзе прапаганда. Але нам пажадана прапагандаваць усё найлепшае»***, — растлумачыў ён.

На нарадзе гаворка ішла не толькі пра эканамічны бок работы СМІ, хоць гэта і найважнейшае пытанне. Беларускі лідар акцэнтаваў увагу, што любая падтрымка можа быць аказана толькі пад канкрэтны план развіцця. «Я вам шчыра кажу: пакуль вы не вычарпаеце свае магчымасці зарабляць, не звяртайцеся да бюджэту. Вы людзі адукаваныя, разумееце, што ў бюджэце лішніх грошай няма. Але калі трэба, і на выхадзе мы будзем бачыць эфект, мы заўжды грошы знойдзем», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што трэба прызнаць, як прафесійна ідзе інфармацыйная вайна. Па яго словах, па дэманізацыі Масквы і Мінска ўжо пераплюнулі Шарпа і Гебельса. ***«Струмені адкрытай, самай нахабнай і дзікай хлусні льюцца на людзей з інтэрнэту. Забыта ўсялякая прыстойнасць. Пра нормы журналістыкі, прафесійную адказнасць увогуле ніхто не ўспамінае. Гэта поўнамаштабная інфармацыйная вайна — за розум нашых людзей, за будучыню нашых дзяцей. І прайграць мы проста не можам»***, — канстатаваў ён.

Паводле слоў лідара краіны, беларуская медыя ўсё часцей перахопліваюць інфармацыйны парадак дня ў інтэрнэце. Беларускія вядучыя тэлеканалы, «СБ», БелТА там заўважныя. Але казаць, што наша інфармацыя там дамініруе, пакуль рана.

## Павінна быць пераемнасць

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, заблакіраваць вядучыя вэб-пляцоўкі — YouTube, некаторыя сацыяльныя сеткі, — як гэта зрабілі ў Расіі, або паставіць «залаты шчыт», як Кітай, тэарэтычна магчыма. Але перш чым зрабіць нейкі крок, трэба ўсё ўзважыць, і спяшацца тут не варта, а трэба быць акуратнымі. «Калі ўсё, што там робіцца, на шкоду, і ў перспектыве яшчэ большая будзе шкода, тады прымайце рашэнне. Калі пакуль да гэтага не дайшло, давайце пачакаем, давайце не будзем спяшацца», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на тым, што трэба прымаць узважаныя рашэнні і развіваць свае рэсурсы. У тым ліку разам з расійскімі калегамі. Але заўсёды трэба бачыць сябе.

***«І асноўнае — кадры. Чалавечы патэнцыял. Трэба, захоўваючы журналісцкія калектывы, знаходзіць новых людзей, маладых, крэатыўных, патрыятычна настроеных.*** Павінна быць пераемнасць», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** падкрэсліў, што асноўныя намаганні міністэрства накіраваны на рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, на выкананне ідэалагічных задач, забеспячэнне нагляднай дзейнасці ў інфармацыйнай сферы. «Прыемна адзначыць, што аналіз інфармацыйнай прасторы Беларусі паказвае ўзрослы давер да дзяржаўных СМІ, давер да ўрада і выверанай палітыкі дзяржавы», — сказаў ён.

Уладзімір Пярцоў назваў прыярытэтныя задачы ў дзейнасці Міністэрства інфармацыі. Першая — паляпшэнне якасці інфармацыйнага прадукту, павышэнне ўзроўню журналістаў. «На гэты конт шмат сказана, але, аб'ектыўна кажучы, ёсць над чым працаваць», — заўважыў міністр. Другая задача — забеспячэнне павелічэння тэлепраграм уласнай вытворчасці. Ён расказаў, што на сёння ўласнага кантэнту ў сярэднім аб'ёме дзяржаўных тэлеканалаў ужо 40,3 працэнта. У перспектыве — пераход на 50—70 працэнтаў уласнага прадукту, але гэта залежыць ад фінансавых магчымасцяў. Трэцяя задача — прасоўванне і ўмацаванне дзяржаўнай пазіцыі ў інтэрнэт-прасторы, уключаючы актыўнае асваенне сацыяльных сетак. Згодна з сацыяльным даследаваннем, 63,2 працэнта жыхароў Беларусі атрымліваюць інфармацыю з інтэрнэт-крыніц, 61,3 — з тэлебачання. Кожны другі карыстаецца сацыяльнымі сеткамі. Чацвёртая задача прадугледжвае ўмацаванне рэдакцый рэгіянальных СМІ, стварэнне рэгіянальных медыяхолдынгаў. «Гэта дасць магчымасць канцэнтраваць фінансавыя і тэхнічныя кадравыя рэсурсы ў галаўной рэдакцыі. І як вынік — стварэнне адзінай кіраванай сістэмы рэгіянальных СМІ. Гэта работа ўжо вядзецца», — расказаў міністр.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

**У нас ёсць бясспрэчная перавага: мы нясём праўду**

Пасля нарады з Прэзідэнтам міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў у размове з журналістамі падвёў вынікі. Паводле яго слоў, ужо ні для кога ні сакрэт, што ідзе не проста інфармацыйнае супрацьстаянне — ідзе сапраўдная інфармацыйная вайна. Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі — на перадавой, і супраць байцоў прымяняюцца самыя жорсткія меры, якія могуць прымяняцца падчас гарачай вайны, аж да фізічнага знішчэння.

«Доказ таго, што работа дзяржаўных СМІ эфектыўная, — тое, што нашы апаненты, якія яшчэ нядаўна выхваляліся сваімі лагатыпамі і назвамі ў сацыяльных сетках, сёння мімікрыруюць пад лагатыпы БелТА і іншых дзяржаўных СМІ. Значыць, яны ведаюць і разумеюць, што нашым дзяржаўным СМІ давяраюць, што гэтыя СМІ карыстаюцца вялікім аўтарытэтам», — заявіў міністр.

Паводле яго слоў, пасля загартоўкі 2020 года дзяржаўныя медыя сталі больш падрыхтаванымі, чым СМІ дзяржаў, дзе праходзілі нядаўна гарачыя падзеі. «Мы згуртаваліся, адкінулі нашы прадузятасці. Мы да 2020 года былі залішне асцярожныя, акуратныя, баяліся кагосьці пакрыўдзіць. Больш у беларускіх СМІ такога няма. Але супраць нас працуе вялізная махіна, якая выкарыстоўвае тэхніку, што імі распрацавана. Мы гуляем на іхнім полі, калі заходзім у асяроддзе інтэрнэт. І нам тут нельга ні ў якім разе расслабляцца, нам трэба быць на крок наперадзе. У нас ёсць бясспрэчная перавага: мы нясём праўду. Нас не прымушаюць хлусіць, прыдумляць фэйкі, мы проста расказваем, як ёсць. У гэтым наша сіла. І нашы ўменні павінны быць накіраваныя на тое, каб гэтую праўду эфектыўна даносіць да гледачоў, слухачоў і чытачоў», — сказаў Уладзімір Пярцоў.

Таксама міністр расказаў, што Прэзідэнт даручыў прапрацаваць да канца месяца не толькі праект указа, які сёння абмяркоўваўся, але і іншыя нарматыўна-прававыя акты, якія дапамогуць дзяржаўным і іншым патрыятычна настроеным СМІ выкваць у гэты няпросты перыяд.

«Я думаю, што плён будзе. Мы прапрацавалі шэраг мер, каб СМІ Рэспублікі Беларусь дастойна развіваліся і працавалі. У нас у краіне ёсць для гэтага патэнцыял. А СМІ павінны выконваць сваю задачу — даносіць праўдзівую і аб'ектыўную інфармацыю», — сказаў ён.

Парламенцкі дзённік

# ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ

**Удзельнікі выязнога пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу далі ацэнку рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, праведзенай з пачатку бягучага года.**

Удзел у пашыраным пасяджэнні, якое праходзіла ў Жлобіне ў Палацы металургаў, бралі сенатары, кіраўніцтва рэгіёна, прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый Гомельшчыны, члены Маладзёжнага парламента і маладзёжных саветаў. У сваім звароце да прысутных **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** асабліва адзначыла, што практыка выязных прыёмаў па асабістых пытаннях добра сябе зарэкамендавала, заўважныя і вынікі:

— Падчас прыёмаў мы прынялі больш за 600 чалавек, — растлумачыла Наталля Качанава. — Пытанні, з якімі звяртаюцца, вельмі важныя. Яны датычацца ўсіх сфер, часцей за ўсё ЖКГ, адукацыі, аховы здароўя, навядзення парадку, распрацоўкі новых законапраектаў, унясення дапаўнення ў дзеючыя. І для членаў Савета Рэспублікі гэта зваротная сувязь з людзьмі вельмі важная.

Як было адзначана, за два месяцы бягучага года ў Савет Рэспублікі паступіла ўжо 1200 зваротаў грамадзян, што на 27 % больш у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам. З Гомельскай вобласці прыняты 153 звароты, або 13 % ад агульнай колькасці.

Увогуле, што датычыцца работы з людзьмі на месцах, упэўнена Старшыня Савета Рэспублікі, уважлівае стаўленне да людзей — гэта асноватворная задача для кожнага кіраўніка:

— Ці гэта дэпутат або член Савета Рэспублікі, ці кіраўнік прадпрыемства або арганізацыі, мы павінны ставіцца да людзей уважліва. Як адзначыў Прэзідэнт нашай краіны, мы павінны ўмець слухаць людзей і, самае галоўнае, чуць іх, — зазначыла Наталля Качанава.

— Мы з вамі павінны зразумець і запомніць раз і назаўжды: колькі б людзей да нас ні прыходзіла, мы павінны іх прымаць. Людзі павінны мець магчымасць запісацца да кіраўніка любога ўзроўню. Усё роўна, што ў нас вызначаны час, людзі павінны мець магчымасць трапіць да таго кіраўніка, да таго чалавека, з якім яны жадаюць сустрэцца. На гэта звярніце асаблівую ўвагу, — матывавала Наталля Качанава.

Спікер верхняй палаты парламента нагадала аб важнай прамой сувязі паміж работай з людзьмі і захаваннем міру, спакою, незалежнасці ў нашай краіне.

Апрача таго, Наталля Качанава засяродзіла ўвагу на ролі ў рабоце з насельніцтвам на месцах дэпутацкага корпуса. З прыняццем абноўленай Канстытуцыі, актыўнай падрыхтоўкай новых законапраектаў, змяненняў і дапаўненняў у дзейныя законы работа са зваротамі грамадзян надзвычай важная для заканатворчай дзейнасці парламентарыяў.

Па выніках пашыранага пасяджэння Прэзідыума Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі на Гомельшчыне спікер верхняй палаты парламента звярнула ўвагу: нягледзячы на тое, што такія выязныя мерапрыемствы ўжо прайшлі практычна ва ўсіх абласцях і Мінску, а на чарзе — Магілёўшчына, падобная практыка аднaзначна будзе прадоўжана і аднолькава ў іншых абласцях краіны.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# УМОВЫ ДЛЯ ALIEXPRESS ПА-БЕЛАРУСКУ

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў на чарговым пасяджэнні восьмай сесіі ўхвалілі ў двух чытаннях праект закона «Аб плацежных сістэмах і плацежных паслугах».**

Навацыі ў дакуменце дапамогуць зрабіць плацежныя паслугі больш таннымі для насельніцтва, скароцяць выдаткі арганізацый пры іх здзяйсненні. Законапраект стварае ўмовы і для развіцця нацыянальных плацежных сістэм і інструментаў. Па словах **першага намесніка старшыні праўлення Нацбанка Сяргея КАЛЕЧЫЦА**, дакументам прадугледжваецца рэгуляванне ўсіх плацежных сістэм, у тым ліку міжнародных, працэсінгавых і клірынгавых цэнтраў і іншых суб'ектаў, на якіх дзеянне заканадаўства пакуль не распаўсюджваецца.

«Таксама законапраект уключае ў сябе комплекснае рэгуляванне дзейнасці па прыёме плацяжоў у адрас трэціх асоб. Дадзеная навацыя дазволіць працаваць на плацежным рынку беларускім арганізацыям, аналагічным Яндэкс, Uber, AliExpress, Booking.com і іншым пляцоўкам-агрэгатарам. Акрамя таго, гэтыя замежныя кампаніі, якія забяспечваюць выкананне ўстаноўленых законам патрабаванняў, змогуць працаваць на тэрыторыі нашай краіны ў роўных умовах з беларускімі пастаўшчыкамі плацежных паслуг», — паведаміў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка.

Дзякуючы закону пашыраецца геаграфія аказання плацежных паслуг. Гэта асабліва актуальна для жыхароў сельскіх мясцовасцяў, дзе адсутнічаюць падраздзяленні банкаў.

«У дадзеным дакуменце пашыраецца суб'ектны пералік пастаўшчыкоў плацежных паслуг, удасканальваюцца віды, інструментарый плацежных паслуг. Гэта дазваляе прыняццем закона павысіць канкурэнтаздольнасць плацежнага рынку, знізіць тарыфную нагрузку на карыстальніка», — расказаў журналістам **Віталь ВАСЮКОЎ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах.**

Дэпутатамі прыняты змены ў законы «Аб магістральным трубаправодным транспарце» і «Аб архіўнай справе і справаводстве». Таксама яны ратыфікавалі два пагадненні. Адно з іх датычылася абмену інфармацыяй у сферы супрацьдзеяння легалізацыі даходаў, атрыманых крымінальным шляхам праз мяжу ЕАЭС. Як пракаментаваў **Сяргей СЫРАНКОЎ, член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах**, дадзены законапраект не датычыцца рэзідэнтаў ЕАЭС, якія не маюць парушэнняў, і фізічных асоб. «Больш за тое, інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў рамках пагаднення, з'яўляецца канфідэнцыяльнай і не можа быць выкарыстана без пісьмовай згоды органа, які выдаў інфармацыю», — дадаў дэпутат.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Блізкая ўлада

# ПЫТАННІ ЎЗЯТЫЯ НА КАНТРОЛЬ

**Тры гадзіны доўжыўся прыём грамадзян першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максімам РЫЖАНКОВЫМ у горадзе Беразіно. Да яго звярнуліся не толькі мясцовыя жыхары, але і з іншых раёнаў Міншчыны з рознымі пытаннямі. Дыялог грамадзян працягваўся тры гадзіны. Максім Рыжанкоў запэўніў заяўнікоў, што ні адзін зварот не застанецца без увагі.**

Зухро Шарыпаву добра ведаюць жыхары Беразіно і раёна. Зухро Махмудаўна працуе ўрачом у мясцовай бальніцы. Жанчына прыйшла па даручэнні жыхароў дома. Яна расказала, што ў пяціпавярховіку, якому ўжо пяцьдзясят гадоў, працякае дах. Як запэўніў намеснік старшыні райвыканкама Сяргей Бабура, у гэтым годзе прадугледжана распрацоўка праектнай дакументацыі на капітальны рамонт. У 2023-м ён будзе выкананы. А сёлета адбудзецца бягучы рамонт даху.

Максім Рыжанкоў паабяцаў, што пракантралюе, каб пытанне было вырашана своечасова і без бюракратычнай валакіты.



Фота ont.by

Жыхарка Беразіно Іна Чорная паскардзілася, што ўжо каторы год абяцаюць пракласці трубы для адводу вады ў канал паміж дамамі па вуліцы Садовай. Але заяўніца атрымлівае на свае пісьмовыя просьбы толькі адпіскі чыноўнікаў. Падчас прыёму грамадзян прадстаўнік мясцовай улады канстатаваў, што работы па ўкладцы труб былі запланаваны яшчэ ў 2021 годзе, але не выкананы ў сувязі з недахопам фінансавых сродкаў. Работы мяркуецца правесці сёлета.

Максім Рыжанкоў запытаў пра канкрэтныя тэрміны. Яго запэўнілі, што пракладка камунікацый пачнецца ў красавіку і закончыцца ў маі. Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта паабяцаў узяць пытанне на кантроль.

Святаслаў Лапыцька з вёскі Жоранаўка распавёў, што хоча ў прыватным доме ўстанавіць кацёл, але не можа спраўдзіць сваю мару, паколькі не хапае магутнасцяў на існуючай электралініі і трансфарматарнай падстанцыі. «Калі будзе замена гэтых камунікацый?» — пацікавіўся заяўнік.

Старшыня Бярэзінскага райвыканкама Дзяніс Дзішук адказаў, што гэтае пытанне злабадзённае для жыхароў раёна, бо многія населеныя пункты не газіфікаваны. Таму ўладкаванне электракатлоў — вельмі важная тэма. Падстанцыі будуць заменены на працягу пяці гадоў, а ў буйных населеных пунктах магчыма і раней.

Як адзначыў Максім Рыжанкоў, выязныя прыёмы грамадзян выяўляюць, што, бывае, калі-нікалі не стае кантактаў у ланцужку «ўлада — грамадзяне». Часам людзей не чуюць, а часам і самі людзі думаюць, што ўлада іх не пачуе і не дапаможа. А хтосьці мяркуе, што чыноўнік з Мінска хутка разруліць іх праблемы. «Хоць часам вырашэнне многіх пытанняў не пад сілу мясцовым уладам. Для гэтага патрабуюцца вялікія грашовыя выдаткі або ўмяшанне рэспубліканскіх органаў улады», — лічыць Максім Рыжанкоў.

Ён застаўся задаволены, што на прыёме грамадзян цікавілі пытанні не толькі прыватныя, але і агульнадзяржаўнага значэння. Па яго словах, у першую чаргу людзей хвалююць пытанні жыццезабеспячэння, жыллёва-камунальныя. У горадзе ідзе ўсё па плане. Але камусьці хочацца, каб тэмпы былі паскораны. «У Беразіно малады, энергічны старшыня райвыканкама, які займае гэтую пасаду крыху больш за год. Магчыма, таму многія і прыйшлі з вялікім «мехам» пытанняў», — лічыць першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Добраўпарадкаванне

# ПРЫБОРКА, КОНКУРСЫ, ЗДАЧА МАКУЛАТУРЫ

## Камунальнікі прапануюць мінчанам крэатыўныя суботнікі

**Азеляніць сталічныя двары больш як васьмю тысячамі дрэў (бяроза, клён, ясень, дуб, ліпа, вярба, туя) і звыш як 28 тысячамі кустоў (дзёран чырвоны, спірэя, бэз, фарзіцыя), а таксама аднавіць 40 гектараў газонаў плануюць сёлета камунальнікі. Да 1 чэрвеня яны таксама абяцаюць пазбавіць двары ад крытычнай ямкавасці.**

Капітальны рамонт дваровых тэрыторый прадстаўляе сабой аднаўленне разбураных аб'ектаў добраўпарадкавання. Як правіла, гэта замена ўдасканаленых пакрыццяў пешаходных сувязяў, дваровых праездаў, замена дзіцячага гульнявога і спартыўнага абсталявання, догляд аб'екта расліннага свету і азеляненне, стварэнне безбар'ернага асяроддзя на прыдомавых тэрыторыях. Калі неабходна, усталёўваюць і вонкавае асвятленне, расказала **Настасся ВАРАБ'ЁВА, намеснік генеральнага дырэктара па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жыллёвага фонду**



**Мінскай гарадской жыллёвай гаспадаркі:**

— Як правіла, у дварах уладкоўваюць і велагаражы. Летась, напрыклад, з'явілася дзевяць такіх пляцовак на 285 веламесцаў. Сёлета гэтая работа прадоўжыцца, у тым ліку і ў межах капрамонту двароў. За чатыры гады, падчас якіх у сталіцы вядуцца работы па капітальным рамонце дваровых тэрыторый, адрамантавана 137 такіх пляцовак. Сёлета капітальна добраўпарадкуюцца яшчэ 14, а на 87 прыдомавых тэрыторый распрацуюць праектна-каштарысную дакументацыю.

Бягучым рамонтам сёлета плануюць ахапіць 743 дваровыя тэрыторыі. Комплексным падыходам адрамантуюць 107 тэрыторый — маецца на ўвазе рамонт прыдомавых тэрыторый, дзе выкананы капрамонт жылля і неабходна аднавіць разбуранае добраўпарадкаванне.

Штогод у Мінску выконваецца і замена асфальтабетонных пакрыццяў дваровых праездаў. На сёлета запланавана адрамантаваць такім чынам 207 тысяч м$^2$. Дзякуючы спрыяльнаму надвор'ю, у асфальт «апранулі» ўжо больш як 9 тысяч м$^2$.

Сумесна з арганізацыямі-перавозчыкамі, якія вывозяць камунальныя адходы, плануюць добраўпарадкаваць 390 кантэйнерных пляцовак і адрамантаваць ці замяніць кантэйнеры для цвёрдых камунальных адходаў і другасных матэрыяльных рэсурсаў.

З 14 сакавіка да 23 красавіка ў сталіцы праходзіць традыцыйны месячнік па паслязімовай прыборцы горада, нагадала спецыяліст і запрасіла на суботнікі насельніцтва, працоўныя калектывы і грамадскія арганізацыі. Падчас месячніка камунальнікі збіраюцца высадзіць больш як чатыры тысячы дрэў і 14 тысяч кустоў. А яшчэ плануюць разнастайныя акцыі, падчас якіх будзе праверана, як гаспадары жывёл вытрымліваюць правілы выгулу і ўтрымання сваіх гадаванцаў, а таксама паркуюць аўто ў дварах. Пройдуць таксама мерапрыемствы па зборы другаснай сыравіны за грошы ў насельніцтва. У кожным раёне на інфармацыйных стэндах дамоў загадзя размесцяць інфармацыю, у які дзень і час у двор прыедзе перасовачны пункт па зборы ДМР — макулатуры, пластыку, шкла.

— У межах месячніка плануецца прыборка дапаможных памяшканняў у месцах агульнага карыстання жылля, напрыклад падвалаў, асабліва там, дзе маюцца сараі жыхароў, гарышчаў, навядзенне парадку на прыдомавых тэрыторыях, у прыватнасці аднаўленне і афарбоўка зламанага гульнявога абсталявання, малых архітэктурных формаў, азеляненне, у тым ліку і з прыцягненнем насельніцтва, — расказала Настасся Вараб'ёва. — Сёлета кожная жыллёва-камунальная гаспадарка запланавала асаблівыя мерапрыемствы ў межах суботнікаў: конкурсы і спартыўныя спаборніцтвы з уручэннем прызоў.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Сусветная гандлёвая арганізацыя папярэдзіла аб галодных бунтах у выніку санкцый Захаду



Рэакцыя заходніх краін на падзеі ва Украіне прывяла да росту цэн на прадукты харчавання па ўсім свеце. Такая сітуацыя можа справакаваць галодныя бунты ў самых бедных краінах. Пра гэта ў інтэрв'ю брытанскай газеце The Guardian заявіла генеральны дырэктар Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА) Нгозі Аконджа-Івеала, паведаміла ТАСС. «Нам трэба быць вельмі ўстрывожанымі. Уплыў цэн на прадукты харчавання і голад у гэтым і наступным годзе можа быць значным. Ежа і энергія — гэта дзве найбуйнейшыя пазіцыі ў спажывецкім кошыку бедных людзей па ўсім свеце», — сказала яна. Нгозі Аконджа-Івеала папярэдзіла, што існуе верагоднасць паўтарэння галодных бунтаў, якія мелі месца ў другой палове 2000-х на фоне росту інфляцыі па ўсім свеце. «Мы заклікаем членамі арганізацыі не пагаршаць крызіс шляхам устанаўлення экспартных абмежаванняў на прадукты харчавання», — падкрэсліла яна.

### Улады Ямайкі маюць намер аб'явіць краіну рэспублікай



Кіраўніцтва краіны аб'явіла аб намеры пазбавіць каралеву Вялікабрытаніі Лізавету II статусу кіраўніка карыбскай дзяржавы, паведаміла газета The Gleaner. Паводле яе даных, прэм'ер-міністр краіны Эндру Хоўлнес аб'явіў аб такім намеры на сустрэчы з унукам каралевы герцагам Кембрыджскім Уільямам, які наведаў Ямайку з афіцыйным візітам. «Мы рухаемся наперад і маем намер у самыя кароткія тэрміны рэалізаваць нашы сапраўдныя амбіцыі ў якасці незалежнай, развітой і квітнеючай краіны», — прыводзіць выданне словы прэм'ера. Візіт члена каралеўскай сям'і справакаваў антыкаланіяльныя выступленні, удзельнікі якіх заклікаюць дабіцца ад Вялікабрытаніі кампенсацый за рабства і паскорыць ператварэнне Ямайкі ў рэспубліку. Часткай дзяржаўнай сістэмы цяпер з'яўляецца каралева Вялікабрытаніі Лізавета II, прадстаўленая генерал-губернатарам, які прызначаецца па рэкамендацыі прэм'ер-міністра краіны.

### Брытанская кампанія інвеступе мільярд фунтаў у сетку зарадных станцый для электрамабіляў

Брытанская энергетычная кампанія BP Plc плануе інвеставаць мільярд фунтаў стэрлінгаў ($ 1,32 млрд) на працягу дзесяці гадоў у будаўніцтва новых станцый для зарадкі электрамабіляў у Злучаным Каралеўстве. Як адзначаецца ў прэс-рэлізе, кампанія да 2030 года разлічвае павялічыць колькасць зарадных станцый у тры разы. Чакаецца, што гэта прывядзе да стварэння сотняў новых працоўных месцаў у краіне. Новыя станцыі будуць аснашчаны прыстасаваннем звышхуткай зарадкі, якія даюць магчымасць за 10 хвілін забяспечыць электрамабілю дастатковы рэсурс для таго, каб праехаць 100 міль (160 кіламетраў).

Ёсць праблема



# Здаровая будучыня — адказнасць кожнага

**Колькасць непаўналетніх, задзейнічаных у распаўсюджванні наркотыкаў і псіхатропных рэчываў, у краіне няўмольна расце**

**У пагоні за лёгкім заробкам дзеці ўвязваюцца ў злачынную дзейнасць, з якой потым не могуць выбрацца. Выкарыстоўваючы маладлетніх у сваіх інтарэсах, арганізатары наркабізнесу ўнушаюць хлопцам і дзяўчатам, што за гэта ім нічога не будзе. Аднак пакарання пазбегнуць не атрымаецца: за распаўсюджванне наркотыкаў і псіхатропных рэчываў крымінальная адказнасць прадугледжана з 14 гадоў.**

З мэтай прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў адбылася міжведамасная рэспубліканская прафілактычная акцыя «Разам за здаровую будучыню». Мерапрыемствы, якія на працягу тыдня ладзіліся ва ўстановах адукацыі і грамадскіх месцах, былі накіраваныя на прафілактыку спажывання і збыту наркотыкаў, псіхатропаў і іх аналагаў сярод непаўналетніх.

І калі да фармату падобных мерапрыемстваў з прафілактычным ухілам мы ўжо прывычаіліся, то наваццый гэтай акцыі стала шырокае распаўсюджванне праз установы грамадскага харчавання і прадуктовыя сеткі тэматычных лістовак з QR-кодам. Наводзячы на яго, трапляеш на кароткі відэаролік, у якім расказваецца аб шкодзе наркотыкаў і псіхатропаў, а таксама наступствах, звязаных з іх распаўсюджваннем.

## ПРАБЛЕМА — ВУСНАМІ ДЗЯЦЕЙ

У рэалізацыі задумкі ўдзельнічалі вучні сталічнай гімназіі № 16. Пасля ўрокаў старшакласнікі раздавалі ў цэнтры горада лістоўкі. Прычым да гэтага хлопцаў і дзяўчат ніхто не прымушаў: падлеткі самі вырашылі падтрымаць акцыю. Амаль усе яны з'яўляюцца валанцёрамі-кансультантамі праекта гімназіі «Роўны навучае роўнага». У межах праекта дзеці прыходзяць у класы і расказваюць іншым навучэнцам пра згубныя звычкі, якія існуюць у грамадстве, прапагандуюць здаровы лад жыцця. Прафілактыка наркаманіі — адзін з кірункаў іх грамадскай дзейнасці.

— Нягледзячы на тое, што сучасныя дзеці вельмі занятыя ў школьны і пазашкольны час, трапляючы ў соцыум, яны не застрахаваны: на вуліцы, у гандлёвых цэнтрах, якія наведваюць школьнікі, вельмі шмат спакус, — лічыць **намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце мінскай гімназіі № 16 Алена КАВАЛЕЎСКАЯ.** — Можна з дакладнасцю казаць, што навучэнцы, якія прынялі ўдзел у акцыі, прапусцілі гэтую праблему праз сябе, не стануць на шлях наркаманії і выберуць правільныя каштоўнасці.

На думку прадстаўніка кіраўніцтва гімназіі, папярэджваць наркаманію і гандаль забароненых рэчываў — у першую чаргу задача і ўстаноў адукацыі. «Важная роля ў гэтым класнага кіраўніка, які кожны дзень бачыць сваіх дзяцей і першым павінен западозрыць, калі нешта пойдзе не так, — заўважыла Алена Кавалеўская. — З дзецьмі, стан якіх выклікае трывогу, працуюць спецыялісты сацыяльнай псіхолага-педагагічнай службы, створаны ў гімназіі. Калі ёсць неабходнасць, яны наведваюць сем'і. Часта гэта прыносіць свой плён. Увогуле, жадасна ўсведамляць, калі дарослыя пытанні вырашаюцца дзіцячымі лёсамі».

## ПАД КАНТРОЛЕМ БАЦЬКОЎ

У адзін з дзён, калі мы сустрэліся з навучэнцамі гімназіі, лістоўкі разышліся ў лічаныя хвіліны. Мінакі з цікавасцю бралі іх, разглядалі, некаторыя нават задавалі пытанні. Падлеткі не губляліся: расказвалі цікавым пра акцыю і зло, якое прыносяць наркотыкі. Падтрымаць акцыю прыйшлі і выпускнікі гімназіі.

— Вельмі прыемна бачыць, што людзі падтрымліваюць акцыю, — падзялілася ўражаннямі старшакласніца Марыя Зацэпіна. — Многія ўдзячныя нам за тое, што мы раздаём лістоўкі, расказваем людзям аб праблеме і сваім прыкладам змагаемся з ёй. Некаторыя адмаўляюцца браць лістоўку, але такіх няшмат. Самае галоўнае, што мы хочам данесці, — тыя, хто распаўсюджвае наркотыкі, нажываюцца на чужой бядзе.

Са сваёй аднакласніцай згодная і Ганна Рыснік. «Мы ведаем, наколькі шкодныя наркотыкі і як людзі губяць імі сваё жыццё, — мяркуе



дзяўчына. — Лёгкіх грошай не бывае. Каб увязацца ў штосьці, перш трэба ўзважыць усе «за» і «супраць». Трэба разумець і тое, што, распаўсюджваючы наркотыкі, чалавек рызыкуе нашкодзіць іншаму, хто нават можа памерці. І гэтую адказнасць трэба будзе несці на сваіх плячах таму, хто гэтыя наркотыкі прадаў».

Старшыня вучнёўскага самакіравання гімназіі № 16 Дзям'ян Саявец, вучань 11 «Б» класа, лічыць, што бясплатны сыр толькі ў пастцы. «Наркотыкі — гэта смерць, — кажа юнак. — Нават той, хто лічыць, што можа своечасова спыніцца, не разумее, што яго жыццё ўжо загублена».

Навучэнцы гімназіі гавораць, што ведаюць аб праблеме не толькі дзякуючы сваім настаўнікам. Вялікую прафілактычную работу з імі праводзяць і бацькі.

— Не трэба баяцца размаўляць на тэму наркотыкаў са сваімі дзецьмі, — перакanana **член бацькоўскага камітэта 10 «А» класа гімназіі № 16 г. Мінска Таццяна ПАЖЭЛАЕВА.** — Аднак трэба не толькі гаварыць, але і быць уважлівымі ў адносінах да сваіх дзяцей. Калі дзіця ўцягнута ў наркабізнес, бацькі не могуць гэтага не заўважыць: адразу мяняецца фізіялагічны стан дзіцяці, адбываюцца змены і ў яго эмоцыях. У прыватнасці, павінны насцярожыць рэзкія перапады настрою, калі на гэта няма падстаў.

У Галоўным упраўленні па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС прадугледзелі і гэта. Праваахоўнікамі распрацаваны метадычныя рэкамендацыі для бацькоў, якія дапамогуць ажыццяўляць кантроль над гаджэтамі непаўналетніх дзяцей.

## ЗАКОННАЯ АЛЬТЭРНАТЫВА

Як расказалі ў Міністэрстве ўнутраных спраў, за мінулы год за распаўсюджванне наркотыкаў і псіхатропных рэчываў крымінальныя справы заведзены ў дачыненні да 111 непаўналетніх. Гэтыя асобы здзейснілі 127 злачынных эпізодаў. Большасць злачынстваў (каля 90 %) ажыццяўлялася пры дапамозе інтэрнэту.

— Праблема ў тым, што маладое насельніцтва, у прыватнасці навучэнцы (пачынаючы ад школьнікаў, заканчваючы студэнтамі), шукаюць магчымасць зарабіць, у тым ліку злачынным шляхам, — адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС палкоўнік міліцыі Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ.** — Як правіла, на гэта ідуць дзеці з нешчаслівых сем'яў, якім не хапае ўвагі, бацькоўскага клопату і, натуральна, грашовых сродкаў. Аднак сярод затрыманых ёсць і непаўналетнія, якія выхоўваюцца ў поўных, забяспечаных сем'ях. Імі ў большасці рухае азарт рызыкі.

Каб моладзь мела магчымасць зарабіць легальным шляхам, праваахоўнікі звярнуліся да Асацыяцыі рэстаранаў і розничных сетак, якія ініцыятыву падтрымалі. У найбліжэйшы час яны прапануюць моладзі працаўладкавацца, каб маладыя людзі мелі магчымасць зарабляць грошы бяспечным законным шляхам. Акрамя таго, падчас акцыі, дзякуючы намаганням асацыяцыі, у рэстаранах, кафэ, іншых установах грамадскага харчавання наведвальнікам прапаноўваліся тыя ж самыя лістоўкі, якія даступнай мовай распавядаюць аб шкодзе наркотыкаў і псіхатропаў, а таксама адказнасці, прадугледжанай за іх распаўсюджванне. Такія ж лістоўкі ўжо маглі бачыць і тыя, хто заказвае дастаўку піцы або сушы на дом.

— Разумеючы, як прыцягнуць увагу моладзі, сумесна з МУС мы стварылі лістоўкі, якія адказваюць сучасным тэндэнцыям, — паведаміў **кіраўнік назіральнага савета Асацыяцыі рэстаратараў Беларусі Яўген ВАСІЛЬЕЎ.** — Наша ўзаемадзеянне не абмяжоўваецца толькі гэтай акцыяй. Сумесна з Міністэрствам эканомікі, Агенцтвам знешнеэканамічнай дзейнасці Банка развіцця ажыццяўляем работу над бізнес-планам, алгарытмам, дарожнай картай па адкрыцці малага бізнесу сярод моладзі. Мы хочам данесці да маладога пакалення, што зарабіць легальнай працай значна прасцей і магчымасцяў нашмат болей. Тыя, хто распаўсюджвае наркотыкі, шукае лёгкіх грошай. Мы прапануем ім законную альтэрнатыву, каб яны маглі зарабіць больш, чым атрымліваюць, будучы наркакур'ерамі.

У межах акцыі «Разам за здаровую будучыню» былі праведзены конкурсы малюнкаў, прэзентацый, навучальныя трэнінгі для педагогаў. У кожным рэгіёне краіны супрацоўнікі міліцыі арганізавалі спартыўныя спаборніцтвы з дзецьмі. Як удакладніў **начальнік аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх галоўнага ўпраўлення ахові правапарадку і прафілактыкі МУС палкоўнік міліцыі Кірыл ПАШКЕВІЧ,** школьнікам і іх бацькам на тэматычных лекцыях расказалі аб медыцынскіх і прававых наступствах спажывання і распаўсюджвання наркотыкаў. «Таксама запрасілі хлопцаў і дзяўчат на выязныя судовыя пасяджэнні, — дадаў прадстаўнік міліцэйскага ведамства. — Не засталіся без увагі і месцы адпачынку моладзі: для спынення фактаў абароту дурману міліцыянеры правялі рэйды».

Падлеткам прапанавалі паўдзельнічаць у конкурсе — для гэтага ім неабходна зняць відэаролік на тэму «Выберы сваю альтэрнатыву» і загрузіць яго ў інтэрнэт. Адным словам, рэзананс у акцыі атрымаўся вялікі. Галоўнае, каб непаўналетнімі была зроблена выснова, што наркотыкі, псіхатропы і ўсё, што з імі звязана, — зло, смерць.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Конкурс

# ПРЫГАЖОСЦІ МАЛА НЕ БЫВАЕ

**У Міністэрстве ўнутраных спраў вызначылі «Міс МУС» і выбралі найлепшыя фотаработы**

**Творчы конкурс «У аб'ектыве» праходзіць ужо трэці год запар. Мяркуючы па колькасці ахвотных у ім удзельнічаць, ён будзе традыцыйным у шэрагу мерапрыемстваў галоўнага міліцэйскага ведамства краіны.**




Сёлета за званне найлепшых фатографаў і відэографаў змагалася больш чым 400 аўтараў з усіх рэгіёнаў краіны. На суд журы яны прадставілі каля тысячы творчых работ. У некаторых намінацыях вызначыць пераможцаў было няпроста: у сваіх фотаздымках і відэароліках канкурсанты здолелі незвычайна і ярка паказаць штодзённую працу супрацоўнікаў міліцыі.

— Няма куточка на карце Беларусі, адкуль бы ні прыйшлі творчыя работы, — адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Дзмітрый КАРЗЮК.** — Прыемна, што людзі бачаць нашу работу пад тым ракурсам, пад якім не бачым мы. Кожная работа вартая ўвагі: гэта чыясьці гісторыя, чыёсьці жыццё. Спадзяюся, што конкурс будзе жыць, работы стануць яшчэ цікавейшымі і мы атрымаем не адну магчымасць паглядзець на гэтую прыгажосць.

І такая ж магчымасць з'явілася ў той жа дзень. Упершыню ў слаўным ведамстве выбралі «Міс МУС». Пераможцу вызначалі таксама па фотаздымках — такім чынам да конкурсу «У аб'ектыве» дадалася яшчэ адна намінацыя.

Самай прыгожай супрацоўніцай органаў унутраных спраў стала начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх Дзяржынскага РАУС капітан міліцыі Ксенія Цупрун. Астатнія канкурсанткі таксама былі ўдастоены ганаровых званняў — лепшых з лепшых вызначалі не толькі па іх знешніх якасцях, але і па выніках службовай дзейнасці.

Як заўважыў Дзмітрый Карзюк, у міліцыі служыць шмат дзяўчат. «Вельмі складаная работа ўскладзена на іх плечы, — удакладніў намеснік міністра. — Удзячны кожнай, якая знаходзіць час у нашай складанай службе ўдзяляць увагу сваёй прыгажосці — унутранай і знешняй».

Як падзялілася Ксенія Цупрун, перамога ў конкурсе стала для яе вялікай нечаканасцю. «Супрацоўніца органаў унутраных спраў павінна быць не толькі прыгожай, — мяркуе капітан міліцыі. — У першую чаргу, яна павінна выконваць свае непасрэдныя службовыя абавязкі. У юным узросце я займаю даволі высокую пасаду. Праца мне падабаецца: яна цікавая, карысная — менавіта з інспекцыі па справах непаўналетніх пачынаецца шлях у дарослае жыццё».

Як паведамілі арганізатары конкурсу, выбіраць «Міс МУС» плануецца кожны год.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы МУС.**

# ВІТАМІНЫ, ІМБІР, КУРКУМІН...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Апошнімі навуковымі звесткамі на гэту тэму падзяліліся **дырэктар Інстытута фізіялогіі НАН Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей ГУБКІН** і **загадчык лабараторыі фізіялогіі харчавання і спорту Інстытута фізіялогіі, кандыдат біялагічных навук Цігран МЕЛІК-КАСУМАЎ.** Яны абагульнілі вынікі міжнароднай практыкі прымянення рэкамендацый Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па харчаванні пры лячэнні COVID-19, а таксама вопыт выкарыстання напрацовак у навуковых і медыцынскіх установах Беларусі і свету.

## ЗБАЛАНСАВАНЫ ПАДЫХОД

Новая інфекцыя, якая стала прычынай глабальнай пандэміі, працягвае выклікаць актыўны інтарэс міжнароднай навуковай і медыцынскай супольнасці. Шырока вывучаюцца як асаблівасці патагенезу гэтага захворвання, так і магчымыя метады тэрапіі, немедыкаментознай падтрымкі і рэабілітацыі цяжкіх пацыентаў. Ужо цяпер відавочна, што ў найбліжэйшыя гады свет сутыкнецца з вялікай праблемай: мільёны людзей, што перахварэлі на ковід, у той ці іншай ступені будуць адчуваць наступствы гэтай інфекцыі. У кагосьці ад каранавіруса церпіць басейн мазгавых сасудаў, у кагосьці — басейн сасудаў сэрца. Але гэта ні для кога не праходзіць бясследна, можа адбівацца на кагнітыўных функцыях чалавека, цягне парушэнні памяці, узмацненне дэпрэсіўных станаў, актывізацыю хвароб Паркінсона, Альцгеймера і кардыялагічных захворванняў.

**«Вітамін D падаўляе асноўныя этапы размнажэння і заражэння клетак каранавірусам».**

Усе мы памятаем, як падчас першай хвалі каранавіруса беларусы актыўна шукалі эфектыўныя спосабы яго прафілактыкі і лячэння народнымі спосабамі. З-за распаўсюджвання чутак аб іх «цудадзейнай сіле» рэзка падаражэлі і нават зніклі з продажу на пэўны час імбір і лімоны.

Аднак гэта інфармацыя аказалася міфам. «Няма ніводнага прадукту, які здольны знішчыць каранавірус ці папярэдзіць яго пападанне ў арганізм чалавека», — запэўнівае Сяргей Губкін. Вядома, што і часнок, і лімон, і імбір утрымліваюць карысныя біялагічна актыўныя злучэнні, але панацэяй — сродкам, які здольны супрацьстаяць інфекцыі, — яны не з'яўляюцца. Шыпшына, цыбуля, абляпіха, сала, сметанковае масла, перац, зялёны чай, рыба ці брокалі не абараняюць нас ад ковіду, хоць іх ужыванне ў ежу, несумненна, карыснае.

Каранавірусная інфекцыя часта суправаджаецца стратай смакавых адчуванняў і апетыту. Сама інфекцыя і агрэсіўныя метады лячэння ў вострым перыядзе хваробы, у тым ліку тэрапія антыбіётыкамі, прыводзяць да парушэнняў стрававання. Слабасць, занепад сіл, павышаная стамляльнасць — не толькі сімптом хваробы, але і частая прычына нядужання ў перыяд аднаўлення. Эксперты разглядаюць харчаванне як важны фактар падтрымкі сіл і энергіі, які павышае эфектыўнасць лячэння. Збалансаваны падыход — дастатковая колькасць лёгка засваяльных пажыўных рэчываў, вітамінаў і мікраэлементаў — дапамагае адначыць сілы, падтрымаць імунітэт і агульнае самаадчуванне.

## ЗДАРОЎЕ МІКРАБІЁМУ

Між іншым, даказана, што COVID лягчэй пранікае ў бронхі і лёгкія, аслабленыя абястлушчанай дыетай, пакольці сурфактант, які высцілае лёгачныя альвеолы і бранхіяльнае дрэва знутры, больш як на 90 працэнтаў складаецца з тлушчаў (фосфаліпідаў). Таму спецыялісты раяць хворым на ковід аддаваць перавагу прадуктам з павышаным утрыманнем бялку і тлушчаў і (або) спецыялізаваным энтэральным сумесям, зыходзячы з прынцыпу — максімум пажыўных рэчываў у адным мілілітры гатовага прадукту. Харчавацца лепш дробнымі порцыямі — 5-6 разоў на суткі, а таксама аддаваць перавагу мяккай і вадкай ежы, «каб ежа і пітво адымалі як мага меней сіл». Можна наразаць прадукты на дробныя кавалачкі ці здрабніць ежу ў блэндары і пры неабходнасці ўсмоктваць праз трубачку. А вось вадкасці трэба шмат — з разліку 25—30 мл на адзін кілаграм вагі чалавека ў суткі.

**«Кішэчнік — найважнейшы імунны орган у чалавека,** — падкрэслівае Сяргей Губкін. — Каля 80 працэнтаў імунакампетэнтных клетак арганізма ўтрымліваецца ў яго слізістай абалонцы. 25 працэнтаў слізістай абалонкі кішэчніка складаюцца з імуналагічна актыўных тканак».

Лічыцца, што 90 працэнтаў захворванняў чалавека могуць быць тым ці іншым чынам звязаныя з кішэчнікам і «здароўем мікрабіёму» (гэта ўнікальная супольнасць мікраарганізмаў, якія засяляюць канкрэтнае асяроддзе). Мікрабіём уплывае на страваванне, імунную сістэму, гаенне ран, прафілактыку хвароб, кагнітыўныя функцыі і нават эмоцыі. Значэнне мікрабіёму для нас настолькі вялікае, што навукоўцы называюць яго новым (а некаторыя — забытым) органам, амаль такім жа важным, як мозг ці сэрца. Мы ўсе ведаем, што ковід мае не толькі лёгачную, але і кішэчную форму, а з распаўсюджваннем штама «амікрон» частата кішэчных формаў павялічылася.

Як толькі вірус трапляе ў арганізм, імунная сістэма тут жа ўключаецца ў барацьбу з «няпрошаным прышэльцам». Эндагенная флора чалавека працуе на мяжы сваіх магчымасцяў, у выніку арганізм слабее. У гэты час яму неабходна дапамога. У перыяд хваробы і рэабілітацыі пасля яе асаблівая важна скарэкціраваць сваё харчаванне так, каб яно ішло на карысць кішэчніку. Рэкамендуецца штодня ўжываць не менш як 400 грам гародніны і садавіны. Прадукты, багатыя на клятчатку, спрыяюць падтрыманню нармальнай мікрафлоры кішэчніка: гэта яблыкі, таматы, салодкі перац, салата, капуста, спаржа, шпінат, цытрусавыя, хлеб з мукі грубага памолу, арэхі, семкі, грыбы, кукуруза, сухафрукты.

— Парушэнне балансу мікрафлоры кішэчніка не можа не адбіцца на агульным імунным статусе, — падтрымлівае калегу Цігран Мелік-Касумаў. — У адным з даследаванняў было паказана, што баланс кішэчніка, парушаны ў выніку інфіцыравання каранавірусам, не мог аднавіцца да кантрольных сярэдніх значэнняў на працягу шасці месяцаў пасля перанесенага захворвання. Між іншым, дысбаланс мікрафлоры, які не ліквідаваўся, можа ўплываць на цяжкасць і працягласць постковіднага сіндрому. А **аднаўленне мікрафлоры, у тым ліку з дапамогай харчавання, можа быць эфектыўным спосабам для больш хуткага аднаўлення пасля хваробы.**



Падтрымліваць нармальную мікрафлору кішэчніка дапамагаюць прадукты, якія ўтрымліваюць прэбіётыкі і прабіётыкі. **Прэбіётыкі** — гэта рэчывы, якія не ўсмоктваюцца і не пераўтраўляюцца ў страўніку і тонкім кішэчніку, але ствараюць спрыяльныя ўмовы для росту і размнажэння карысных бактэрый кішэчніка. А **прабіётыкі** — мікраарганізмы і рэчывы мікробнага і іншага паходжання, якія пры натуральным спосабе ўвядзення аптымізуюць яго мікраэкалагічны статус. Так, было даказана, што ў людзей, якія на працягу 15 дзён атрымлівалі прабіётыкі, павялічваецца колькасць імунаглабулінаў M і G (ахоўных малекул). Да таго ж прыменение прабіётыку паляпшае стан пацыентаў ва ўзросце, старэйшым за 45 гадоў, у тым ліку і ў людзей з першай стадыяй атлусцення.

## ЧЫМ НЕБЯСПЕЧНЫ ДЭФІЦЫТ?

Многіх цікавіць, а наколькі карысныя пры COVID-19 вітаміны і біялагічна актыўныя дабаўкі (БАДы)? Усе клінічныя і медыцынскія даследаванні сыходзяцца на тым, што ключавая роля належыць вітамінам D, C, цынку і селену.

— У нашых кліматычных умовах многія адчуваюць дэфіцыт вітаміну D, між іншым, менавіта гэты вітамін даказаў сваю эфектыўнасць і пры прафілактыцы, і пры лячэнні ковіду, — падкрэслівае Цігран Мелік-Касумаў. — Даказана, што вітамін D падаўляе асноўныя этапы размнажэння і заражэння клетак каранавірусам. Навукова абгрунтаваная не толькі яго эфектыўнасць, але і механізм уздзеяння пры каранавірусе.

Вітамін C, у сваю чаргу, працуе ў нашым арганізме як антыаксідант і прыпыняе ўтварэнне свабодных радыкалаў. Цынк у патагенезе спыняе пранікненне каранавіруса ў клетку, звязванне віруса з клеткай і трансляцыю ферменту, які дапамагае вірусу размнажацца, гэта значыць, спыняе яго размнажэнне ўжо ўнутры інфіцыраванай клеткі.

Дастатковае ўтрыманне ў арганізме такога мінеральнага элемента, як селен, таксама важнае для барацьбы з ковідам і іншымі рэспіраторнымі захворваннямі. З гэтым пагаджаюцца ўсе даследчыкі. У 2022 годзе выйшаў агляд, дзе дакладна паказана, што дэфіцыт у арганізме ўсіх пералічаных вышэй вітамінаў і мікраэлементаў істотна павышае працягласць шпіталізацыі, рызыку цяжкага працякання захворвання, развіцця вострага рэспіраторнага дыстрэс-сіндрому і смерці пацыентаў.

**«Няма ніводнага прадукту, які здольны знішчыць каранавірус ці папярэдзіць яго пападанне ў арганізм чалавека»**

Дарэчы, у 2020 годзе больш за 200 навукоўцаў і медыкаў падпісаліся пад адкрытым лістом, адрасаваным урадам усіх краін. У дакуменце змяшчаўся заклік неадкладна і паўсюдна павялічыць спажыванне вітаміну D (да 4000 IU/100 мкг у дзень) у сувязі з павышанай рызыкай заражэння і цяжкага працякання COVID-19 для людзей з небяспечным дэфіцытам гэтага вітаміну ў арганізме. Паводле ацэнак спецыялістаў, доля такіх у большай частцы свету складае 33 % ад насельніцтва.

Трэба мець на ўвазе, што лідарам па ўтрыманні вітаміну С з'яўляюцца чорныя парэчкі, шыпшына, журавіны, квашаная капуста, балгарскі перац, зялёная ліставая гародніна. Рэкамендуецца ўжываць ягады і гародніну глыбокай замарозкі, якія не губляюць сваіх карысных уласцівасцяў. У спісе прадуктаў, якія лідзіруюць па ўтрыманні вітаміну D, — рыба тлустых гатункаў: селядзец, ласось, скумбрыя, сардзіны і іншыя. Вялікая колькасць вітаміну D і ў печані траскі. Таксама параўнальна шмат яго ў яйках (асабліва ў жаўтку), сметанковым масле, ялавічнай печані. Менавіта таму рэкамендуецца ўключаць гэтыя прадукты ў свой рацыён на рэгулярнай аснове.

## НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА

А ці апраўдваюцца надзеі, звязаныя з куркумой? **Куркумін — моцны імунны стымулятар і прыродны антыбіётык,** які перашкаджае развіццю бактэрыяльных ускладненняў пры вірусных інфекцыях, спыняе рост патагеннай мікрафлоры ў нашым кішэчніку. Але доказаў, што ён можа спыніць каранавірус, пакуль няма. Часнок і цыбуля ўтрымліваюць аліін — рэчыва, якое называюць прыродным антыбіётыкам. Традыцыйна многія выкарыстоўваюць іх для прафілактыкі і лячэння грыпападобных сімптомаў, і гэта не пазбаўлена сэнсу.

**«Куркумін — моцны імунны стымулятар і прыродны антыбіётык».**

Імбір утрымлівае вітаміны групы C, B і A, цынк, кальцый, ёд, прыродныя і антыгрыбковыя антыбіётыкі. Падчас даследавання ў пацыентаў, якія замест плацэба атрымлівалі настойкі імбіру і эхінацэі, змяншалася колькасць скаргаў на кашаль, мышачныя болі і праблемы з дыханнем.

Актыўнасць у дачыненні да вірусаў даказалі кверцэцін і грэйфтсін, якія ўтрымліваюцца ў зялёным чаі, жоўтым перцы, спаржы, вішні, каперсах, чырвонай цыбулі, чырвоным вінаградзе і марскіх водарасцях.

Увогуле, у склад некаторых прадуктаў уваходзяць рэчывы, якія «ў прабірцы» дэманструюць здольнасць абясшкоджваць каранавірус. Так, у праведзеным даследаванні нямецкіх навукоўцаў каранавірус «у прабірцы» падвяргалі ўздзеянню зялёнага чаю, соку аронii (чарнаплоднай рабіны) і гранатавага соку — прадуктаў з высокім утрыманнем антыаксідантаў.

Сок аронii паказаў самую высокую эфектыўнасць — за пяць хвілін уздзеяння інфіцыруючая здольнасць віруса знізілася на 97 %. Гранатавы сок і зялёны чай прыводзілі да інактывацыі віруса на 80 % за адну хвіліну ўздзеяння. Паколькі першапачатковае і хуткае размнажэнне каранавіруса адбываецца ў насаглотцы, паласканне горла зялёным чаем і сокамі аронii і граната можа стаць стратэгіяй зніжэння верагоднасці заражэння і захворвання на COVID-19, мяркуюць даследчыкі. У адрозненне ад шматлікіх аптэчных антысептыкаў для паласкання горла, гэта натуральныя прадукты. Іх можна рэгулярна выкарыстоўваць для прафілактыкі. Аднак усе гэтыя мерапрыемствы нельга лічыць заменай стандартным мерам бяспекі і прафілактыкі, а толькі дапаўненнем да іх.

Увогуле, як адзначаюць вучоныя, нягледзячы на пазітыўныя эфекты ад многіх біялагічна актыўных рэчываў раслiннага паходжання з антыаксідантным і імунамадулюючым эфектам, патрабуецца больш доказаў іх клінічнай эфектыўнасці. А навуковых работ, у якіх бы мэтанакіравана адсочвалася сувязь дыет рознага тыпу і захворвання на COVID-19, пакуль няшмат.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Багатыя рэгіёнамі

# ПАЗІЦЫІ ЗДАВАЦЬ НЕ ЗБІРАЕМСЯ

## Старшыня Бялыніцкага раёна Васіль ЗАХАРЭНКА — пра адметнасці горада, творчы патэнцыял і стаўкі на ўраджай

**Па выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця за мінулы год Бялыніцкі раён у сваёй намінацыі сярод гарадоў і раёнаў з насельніцтвам да 20 тысяч чалавек быў прызнаны найлепшым у Магілёўскай вобласці. Старшыня райвыканкама Васіль Захарэнка атрымаў пераходны сцяг, дыплом I ступені і 450 базавых велічынь на развіццё раёна. Карэспандэнт «Звязды» павіншавала пераможцаў і распытала кіраўніка раёна, што трэба для таго, каб перамагчы, і што ў планах далей.**



***— Першае, на што звяртаеш увагу, калі прыязджаеш у горад, — чысціня, утульнасць, вясёлы сонечны колер будынкаў. Наколькі важную функцыю выконвае знешні выгляд населенага пункта?***

— Наш горад істотна памяняўся ў 2020 годзе, калі адбыўся Дзень пісьменства. Спецыяльна падбіралі колеравую гаму, каб ён выглядаў радасна. Дахі зрабілі чырвоныя, а самі будынкі пафарбавалі ў жоўта-карычневы колер. Дырэктар нашага «Жылкамгаса» Віктар Івулёў ураджэнец горада і цалкам адданы яму чалавек, у сістэме камунальнай гаспадаркі працуе з канца 80-х. Дарэчы, па выніках работы за мінулы год атрымаў званне «Чалавек года». На сёння ў горадзе амаль няма скаргаў па камунальцы, пытанні вырашаюцца да таго, як паступаюць. Не паспеў растаць снег, а наша прадпрыемства прыступіла да ямачнага рамонту. У планах — да мая навесці з гэтым парадак. «Жылкамгас» утрымлівае Бялынічы ў стылі горада ўтульнага камфорту.

Шмат увагі ўдзяляецца азеляненню. У прадпрыемства ёсць уласны гадавальнік і цяпліцы, штогод на клумбы яны высаджваюць да 40 тысяч розных кветак. І гэта без уліку іншых прадпрыемстваў і арганізацый, на балансе якіх таксама ёсць кветнікі. Шмат высаджваецца кустоў і дрэў. Штогод праводзіцца кранаванне. Работа з дрэвамі наогул паказальная, яны выглядаюць дагледжанымі і надаюць населенаму пункту прыгожы выгляд. У нас шмат паркаў і сквераў. Людзі цэняць работу камунальных службаў і падтрымліваюць чысціню.

***— Якія задачы стаяць перад кіраўніцтвам раёна на сёння?***

— Асноўная задача — не пагоршыць жыццё насельніцтва, каб былі працоўныя месцы і зарплаты. І для забеспячэння гэтага працуем над выкананнем даведзеных паказчыкаў. Па выніках работы за 2020 год мы былі трэція ў вобласці, за 2021 — першыя. Гэта вялікая адказнасць, наша задача — утрымаць пазіцыі. Не хацелася б аддаваць іншым гэты сцяг. Сёння першачарговая задача — паспяхова правесці сельскагаспадарчую кампанію. Тэхніка гатовая, абласны бюджэт падтрымаў фінансава, ну і самі гаспадаркі падрыхтаваліся.

***— І якія планы на сёлетні ўраджай?***

— Задачы стаяць вельмі амбіцыйныя. Нам трэба прырасці і сур'ёзна да ўзроўню леташняга ўраджаю. Мы добрымі тэмпамі раслі два апошнія гады, і сёлета збіраемся дадаць не менш чым 5-6 працэнтаў.

***— На якія гаспадаркі робіцца стаўка?***

— Лідар па-ранейшаму СВК «Калгас «Радзіма»: гаспадарка дае палову ўсёй прадукцыі па раёне. Кіраўнік дзяржавы паставіў перад намі задачу падцягваць і астатнія гаспадаркі да ўзроўню «Радзімы». На жаль, вядомы яе кіраўнік Аляксандр Міхайлавіч Лапацентаў летась пайшоў з жыцця. Але на змену яму прыйшоў яго сын — Алег Лапацентаў. Сямейныя традыцыі захоўваюцца.

***— А што з сябе ўяўляе раённы рэальны сектар эканомікі, які яго ўнёсак у агульную перамогу?***

— Летась правёў рэканструкцыю пратэінавы завод, які спецыялізуецца на вытворчасці мукі і тэхнічнага тлушчу. За кошт істотнай мадэрнізацыі прадпрыемства змагло значна павысіць аб'ёмы вытворчасці. Філіял замежнага таварыства з абмежаванай адказнасцю «БАНЕЦІ» завяршыў праект па вытворчасці дацкай беконнай свініны. Гэта прадпрыемства працуе ў нас з 2020 года, але летась выйшла на поўную магутнасць. Наогул, кожны зрабіў свой унёсак у агульную справу. У тым ліку і малы бізнес. З 301 прадпрымальніка летась зарэгістраваліся 35. І ніхто з іх закрывацца не збіраецца. Ёсць праблемы з пастаўкамі на экспарт у далёкае замежжа, але ідуць пошукі новых рынкаў збыту.

***— Бялынічы пазіцыянуюць сябе яшчэ і як горад мастакоў і пісьменнікаў.***

— Сапраўды. Нездарма нам зрабілі такі цудоўны музей да Дня пісьменства. Прычым цалкам сучасны. Пасля музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску наш стаў другім у краіне па маштабнасці зробленай работы. А ўлічваючы, што ён пабудаваны не дзесьці ў сталіцы, а ў райцэнтры, гэта шмат пра што гаворыць. У нас вельмі моцныя мастацкія традыцыі. Адно імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі чаго каштуе! У райцэнтры жыве вельмі таленавітая мастачка Ларыса Журавовіч. Цыкл яе карцін «Вяртанне» прысвечаны сакральным месцам, быў высока адзначаны. Цяпер яна працуе над новай серыяй — «Чалавек працы». Піша партрэты людзей на працоўных месцах.

***— Бялыніччына быццам бы створана для развіцця турызму. Тут і таямнічыя сакральныя месцы, і цудоўныя азёры, і прыгожыя ландшафты...***

— Турыстычныя маршруты распрацаваны, запрашаем аматараў падарожжаў! Уражанняў будзе шмат. У нас выдатныя ўмовы для палявання, лясгас паклапоціцца, каб госці былі задаволеныя. Да нас прыязджаюць паляваць з усёй Беларусі і з-за мяжы. Ну, а наша Заазер'е — наогул месца паломніцтва аматараў летняга адпачынку. Шмат месцаў, звязаных з рэлігійным кірункам. Наш горад знаходзіцца пад аховай Бялыніцкай Божай Маці, якая, па гістарычных звестках, дала пачатак яго будаўніцтву. З ёй звязана шмат розных цудаў і паданняў. І гэта таксама вабіць сюды турыстаў. Асабліва ў храм іконы Бялыніцкай Божай Маці. Людзі едуць здалёк, каб пакланіцца гэтай святыні.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

*Бялыніцкі раён.*

Сітуацыя

# Тарфяная справа для невяскоўцаў

## Чаму брыкет — недарагі, а яго дастаўка — наадварот

**Штогод у Беларусі здабываюць каля 2 млн тон торфу, доля якога ў агульным выкарыстанні мясцовых відаў паліва (МВП) складае 15 %. З яго вырабляюць да 900 тысяч тон брыкету. У краіне для ацяплення брыкет выкарыстоўваюць прыкладна ў 200 тысячах дамоў, а жыхарам, якія маюць пастаянную рэгістрацыю (прапіску) у вёсцы, на яго набыццё даюцца субсідыі. Пры гэтым агульнаўстаноўлены па краіне ліміт на чорнае паліва па субсідзіраваным кошце — 3,5 тоны на домаўладанне (фактычная лічба вызначаецца на абласным узроўні). А вось для тых беларусаў, хто не мае пастаяннай рэгістрацыі ў вёсцы (нават калі яны рэгіструюцца і жывуць тут цэлы год, але пастаянна зарэгістраваны ў іншым месцы), брыкет выйдзе ледзь не даражэйшы за дровы. Чаму так, карэспандэнт «Звязды» высвятляла ў спецыялістаў галіны.**

### Свабодная цана — да 90 рублёў, субсідзіраваная — каля 40

Торфапрадпрыемствы аднагалосна зацікаўлены і ў большых продажах прадукцыі прыватным пакупнікам і гатовы адгружаць паліва непасрэдна з прадпрыемства. Паліўназабяспечвальныя прадпрыемствы абласцей, іх філіялы працуюць і з насельніцтвам, і з арганізацыямі. Адпускная цана брыкету — да 90 рублёў за тону, а людзі, якія маюць права на субсідыі, плацяць за яго прыкладна па 40 рублёў за тону. Розніца субсідзіруецца з раённага бюджэту.

Сістэма рэалізацыі брыкету насельніцтву дакладная, сцвярджаюць спецыялісты. Але ці выгадна гэта звычайнаму спажыўцу?

— Мы зацікаўлены, каб бралі яшчэ больш нашай прадукцыі. Аб'ёмы паставак агаворваюцца. Штодня філіялы аблпаліва ад нас вывозяць па 200—250 тон брыкету для жыхароў. А вось установы, якія ацяпляюцца брыкетам, сельскія бальніцы, бібліятэкі, спартыўныя школы, ФАПы, заказваюць у нас напрамую, — агучыў **Казімір БАНЦЭВІЧ, дырэктар торфабрыкетнага завода «Дзітва».**

### Чарга «тарфяных ільготнікаў»

Тыя, хто гатовы купіць брыкет па поўным кошце, часцей за ўсё могуць разлічваць на яго хуткую дастаўку, аднак і тут здараюцца недарэчнасці.

Па-першае, чарга «тарфяных ільготнікаў» і тых, хто гатовы набыць яго па свабоднай цане, часта можа канчаткова сфарміравацца бліжэй да восені, калі ацяпляльны сезон ужо пачаўся. А грузавыя машыны ў тую пару ўжо занятыя працай у палях і ім няма часу на дастаўку паліва, тлумачаць у сельсаветах. Людзям даводзіцца чакаць, што не ўсім падабаецца.

Па-другое, на складах у арганізацыях райпалівазбыту, як правіла, няма запасу прадукцыі (асабліва напрыканцы года). А ў многіх арганізацыях часта проста няма ўмоў для захоўвання — брыкет фактычна толькі для тых, хто падаў заяўку своечасова і мае права набыць яго па субсідзіраваным кошце. Калі ж чалавек будзе заказваць брыкет у лістападзе — снежні, у яго ёсць шанцы ўвогуле застацца без паліва. Нават заказаны брыкет, здараецца, не паспявае даехаць да спажыўца. Пасля канчаецца каляндарны год і чарга ствараецца нанова, а лічбы нерэалізаванай заказанай прадукцыі абнуляюцца.

— Мы пачынаем нагадваць людзям пра заказ брыкету і дроў ужо ў студзені. І стараст вёсак просім тэлефанаваць аднавяскоўцам. Стараемся сфарміраваць разам не менш як тры заяўкі ад людзей, каб адправіць машыну — так танней выходзіць, — расказаў **Сяргей БАРЫЧЭЎСКІ, старшыня Турэцкага сельвыканкама (Карэліцкі раён)**, які з'яўляецца пасрэднікам паміж «гартопам» і спажыўцом. — Мы не толькі збіраем заяўкі ад людзей, але і фарміруем адпаведныя дакументы: пацвярджэнне права на льготу па субсідыях ці інваліднасці, даведкі, што чалавек пражывае на тэрыторыі сельсавета, што не карыстаецца для ацяплення ні газам, ні электрычнасцю.

Напрыканцы года і з дровамі, і з брыкетам напружана. Каб не страціць сваю льготу на паліва і не прапусціць чаргу, вяскоўцам варта ўсё ж заказваць яго вясной і не чакаць да апошняга, каб пасля не крыўдзіцца і не абурацца, параіў старшыня.

### «Паліўны ланцужок»

Заводы гатовы вырабляць прадукцыю, і яна запатрабавана насельніцтвам. «Паліўны ланцужок» працуе па пэўнай схеме. Штогод торфапрадпрыемствы атрымліваюць у аблвыканкамах заяўкі на брыкет ад насельніцтва ў разрэзе раёнаў. Гэты план у тым ліку ўплывае і на аб'ёмы здабычы торфу, зазначыў **Уладзімір НЯЛЮБАЎ, галоўны спецыяліст аддзела тэхнічнага забеспячэння вытворчасці ўпраўлення тарфяной прамысловасці Белпалівагаза:**

— Летам райпалівазбыт можа браць вельмі мала прадукцыі, а ўжо ў ацяпляльны перыяд пачынаецца ажыятаж, калі бяруць нават больш брыкету, чым было запланавана. Летась па ўсіх абласцях «гартопам» для рэалізацыі насельніцтву паставілі нават больш, чым патрабавалася спажыўцам, згодна з дакументамі, — амаль 300 тысяч тон замест 265 тысяч.

Пры гэтым у некаторых раённых няма ўласных пляцовак для складзіравання брыкету — яны працуюць напрамую з торфапрадпрыемствамі. А часта проста не хочуць ствараць запас прадукцыі. У гэтым ацяпляльным сезоне, дарэчы, дэфіцыт брыкету ўзнік з-за праблемы з дровамі, якіх шмат пайшло за межы краіны, і цана на іх узнялася, дадаў ён.

Як варыянт — спажывец, каб набыць брыкет, можа звярнуцца на торфапрадпрыемства. Аднак ёсць акалічнасць, якая робіць «залатой» дастаўку чорнага паліва па свабоднай цане. Гэта аплата дарогі, цана за якую, калі торфапрадпрыемства далёка ад заказчыка, перавышае кошт самога брыкету.

### Права на паліўную кніжку і субсідыю

Катэгорыі грамадзян, якім палажаны брыкет па субсідзіруемым кошце, абазначаны таксама ў пастанове Саўміна № 1028. У дакуменце сказана, што вясковыя жыхары, якія знаходзяцца ў спісе тых, хто мае патрэбу ў такім паліве, з указаннем іх імя, імя па бацьку, прозвішча і адраса, павінны прад'явіць сведчанне асобы і паліўную кніжку. Апошнюю можна атрымаць на падставе дакумента, які сведчыць асобу, і даведкі аб жылым памяшканні і складзе сям'і. Выдаць такую даведку (тут указана плошча дома, згодна з якой разлічваецца колькасць неабходнага для ацяплення паліва) чалавеку, які не зарэгістраваны (не прапісаны) у вёсцы пастаянна, нельга. Адпаведна, ён не можа атрымаць паліўную кніжку і не мае права на «паліўную» субсідыю.

Для вяскоўцаў, згодна з законам, дзяржавай субсідзіруецца не толькі адпускная цана на брыкет, але і кошт яго дастаўкі. Людзі, якія набываюць гэтае паліва па свабоднай цане, такой магчымасці не маюць. Пры заказе брыкету для такой катэгорыі насельніцтва кошт дарогі з торфапрадпрыемства «гартопу» не субсідзіруюць. І ён мусіць напоўніцу ўзяць грошы і за дастаўку прадукцыі да спажыўца, і дадаць сюды ПДВ (пры субсідзіраванні гэты падатак не налічваецца).

Заканадаўствам таксама прадугледжана, што ўсе льготы, якімі можа карыстацца чалавек, прывязаныя да месца яго пастаяннай рэгістрацыі. Атрымліваючы льготы ў адным месцы, ён не можа прэтэндаваць на іх у іншым, дзе зарэгістраваны часова. Пералік за некаторыя паслугі ЖКГ зацверджаны пастановай Саўміна № 1466. Калі чалавека працяглы час не жыве па месцы пастаяннай рэгістрацыі, ён можа не плаціць за карыстанне некаторымі паслугамі ў дадзены тэрмін. Аднак гэтыя ў пэўным сэнсе сэканомленыя сумы ўсё роўна цяжка параўноўваць з коштам дастаўкі брыкету.

Вось такая атрымліваецца сітуацыя. Прадпрыемствы хочуць павялічваць рэалізацыю прадукцыі насельніцтву, якое, прынамсі, на вёсцы ў многіх месцах натуральна змяншаецца. А тыя, хто ў вёсцы не прапісаны пастаянна, купіць чорнае паліва дазволіць сабе не могуць, бо свабодны кошт кусаецца. Выступіць з ініцыятывай дазволіць зарэгістраваным па месцы вясковага жыхарства людзям набываць паліва па субсідзіраванай цане могуць аблвыканкамы. Магчыма, там проста не ведаюць аб гэтай «мясцовай» праблеме?

**Ірына СІДАРОК.**

# ЗУБЫ НА ПАЛІЦУ



## Чаму разгортваецца сусветны харчовы крызіс

**Генеральны сакратар ААН Антоніу Гутэрыш папярэдзіў аб пагрозе «ўрагану голаду». «Наступствы ўжо адчуваюцца па ўсім свеце з рэзкім ростам цэн на прадукты харчавання, энергію і ўгнаенні», — сказаў ён, паведаміла ТАСС. Парушаны ланцужкі паставак. Як заўважыў Гутэрыш, неабходна «зрабіць усё магчымае, каб прадухіліць крах глабальнай харчовай сістэмы». Сусветная шокавая хваля закранула не толькі краіны, якія развіваюцца, у Афрыцы, Азіі і Лацінскай Амерыцы, яна спустошыла паліцы крам заможных дзяржаў Паўночнай Амерыкі і Еўропы. Прычын патавай сітуацыі некалькі, адна з асноўных — бязглуздая санкцыйная палітыка калектыўнага Захаду. Чаму ж разгортваецца найцяжэйшы пасля Другой сусветнай вайны глабальны харчовы крызіс?**

### ПАГРОЗА БЯСПЕЦЫ

Свет сутыкнецца з дэфіцытам харчавання і голадам, калі Расія і Украіна спыняць экспарт пшаніцы, паведаміла The Guardian. Цэны на пшаніцу, кукурузу і соевыя бабы ўжо перавысілі ўзровень 2008 года, калі свет сутыкнуўся з глабальным фінансавым крызісам. Як адзначаюць эксперты, кошт прадуктаў харчавання павялічваўся ва ўсім свеце і да падзей ва Украіне з-за наступстваў глабальнага кліматычнага крызісу і ўздзеяння пандэміі COVID-19. Аднак зараз пад пагрозай сяўба ва Украіне, якая з'яўляецца адным з найбуйнейшых экспарцёраў пшаніцы. Пастаўкі з Расіі таксама могуць аказацца пад пагрозай, калі Масква скароціць экспарт пшаніцы ў адказ на заходнія санкцыі.

Па даных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (ФАО), Расія з'яўляецца найбуйнейшым у свеце экспарцёрам пшаніцы з доляй каля 17 працэнтаў на сусветным рынку і другім па велічыні пастаўшчыком насення сланечніку. Украіна — пяты па велічыні экспарцёр пшаніцы, на яе долю прыпадае каля 10 працэнтаў сусветнага рынку. Яна таксама з'яўляецца адным з найбуйнейшых экспарцёраў кукурузы — каля 15 працэнтаў глабальнага экспарту. Пры гэтым 40 працэнтаў паставак пшаніцы з Чарнаморскага рэгіёна прыпадае на Блізкі Усход і Афрыку, дзе рост цэн на прадукты харчавання ўжо моцна адчуваецца.

Як заявіў прэзідэнт Міжнароднага фонду сельскагаспадарчага развіцця Гілберт Хунгба, прагнозы несуцяшальныя: мяркуецца, што будуць абмежаваны сусветныя пастаўкі асноўных культур, такіх як пшаніца, кукуруза і сланечнікавы алей, што прывядзе да рэзкага росту цэн на прадукты харчавання і голаду. «Гэта можа паставіць пад пагрозу глабальную харчовую бяспеку і ўзмацніць геапалітычную напружанасць», — лічыць Гілберт Хунгба.

Паводле статыстыкі, кожнаму дзясятаму чалавеку ў свеце ўжо не хапае ежы, і пандэмія пагоршыла праблему, парушыўшы дзейнасць рынкаў і ланцужкі паставак прадуктаў харчавання. На сітуацыю таксама ўплываюць наступствы змены клімату. Так, цэны на цвёрдыя сарты пшаніцы, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці макаронных вырабаў, падскочылі на 90 працэнтаў напрыканцы мінулага года пасля шырокамаштабнай засухі і рэкорднай спякоты ў Канадзе, адным з найбуйнейшых у свеце вытворцаў збожжа.

### АБЯЦАНКІ АД МАСКА

Найбуйнейшыя сельскагаспадарчыя рэгіёны ЗША летась перажылі лясныя пажары і экстрэмальныя ўмовы надвор'я. Многія раёны Лацінскай Амерыкі пацярпелі ад засухі. У той жа час Аўстралія пакутуе ад разбуральных паводак.

Рэгіён Афрыканскага Рога ўжо сутыкнуўся з праблемай голаду. Тры сезоны дажджоў знішчылі пасевы і выклікалі масавую гібель жывёлы. Недахоп вады і пашы прымушае тысячы сем'яў пакідаць свае дамы і правакуе канфлікты паміж абшчынамі. Паводле слоў рэгіянальнага дырэктара Сусветнай харчовай праграмы ААН ва Усходняй Афрыцы Майкла Данфарда, сітуацыя ў рэгіёне патрабуе неадкладных гуманітарных дзеянняў.

Дырэктар Сусветнай харчовай праграмы ААН Дэвід Бізлі папярэдзіў еўрапейскіх лідараў аб тым, што з надыходзячым харчовым крызісам неабходна спраўляцца ўжо цяпер — у іншым выпадку ім давядзецца сутыкнуцца з міграцыйным крызісам, падобнага якому яны раней не бачылі. «Нам не хапае мільярдаў долараў. Калі мы іх сёлета не атрымаем, то будуць голад, дэстабілізацыя і масавая міграцыя. Калі вы думаеце, што ў нас зараз пекла на зямлі, то вы толькі пачакайце. Калі вы кінеце Паўночную Афрыку, яна прыйдзе ў Еўропу. Калі вы кінеце Блізкі Усход, ён прыйдзе ў Еўропу», — заўважыў у інтэрв'ю Politico Дэвід Бізлі. Як удакладняе газета, асноўныя праблемы абумоўлены перабоямі ў пастаўках прадуктаў харчавання і рэзкім ростам цэн на яго.

Бізлі спрабуе сабраць неабходныя грошы пры дапамозе ахвяраванняў урадаў ці прыватных донараў. Найбольшую дапамогу арганізацыі аказваюць ЗША, Германія і Еўракамісія, але не ўсе еўрапейскія дзяржавы ўносяць роўны ўклад: у 2020 годзе Францыя, напрыклад, ахвяравала менш за палову таго, што ўнесла Расія. Цяпер праграма спадзяецца на дапамогу найбагацейшых людзей планеты, накшталт заснавальніка Amazon Джэфа Безаса або Tesla Ілана Маска. Паводле яго слоў, гэта «ганьба для чалавецтва», што «мы выпрошваем некалькі мільярдаў долараў», калі кіраўнікі тэхналагічных кампаній шматразова павялічылі свой асабісты капітал падчас пандэміі.

Бізлі ўжо спрабаваў дамовіцца з Іланам Маскам, які паабяцаў аддаць значную суму, калі Бізлі растлумачыць, як ён плануе пакончыць з голадам ва ўсім свеце. «Ад яго я пакуль атрымаў шмат каментарыяў, але ніводнага цэнта», — распавёў Бізлі. У Еўрасаюзе таксама пакуль абмежаваліся абяцаннямі.



### Б'Е БУМЕРАНГАМ

Значна абвастрылі харчовы крызіс бязглуздыя санкцыі. «Перад шэрагам сур'ёзных і агульных выклікаў міжнародная супольнасць павінна была аб'ядноўвацца і супрацоўнічаць, каб пераадолець цяжкасці, але ў рэальнасці некаторыя падбухторваюць да раздзялення на групы і процiборства, памнажаюць рознагалоссі і штурхаюць свет да новай халоднай вайны любой цаной, — заявіў генеральны сакратар Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва Чжан Мін, паведаміла ТАСС. — У апошнія гады некаторыя краіны ўвасобілі шэраг аднабаковых, пратэкцыянісцкіх мер, сярод якіх увядзенне санкцый, тарыфная і гандлёвая вайна, стыгматызацыя і іншыя». Паводле яго слоў, яны нанеслі вялікі ўрон глабальным вытворчым ланцужкам, ланцужкам паставак, патокам капіталу і інвестыцыйнай дзейнасці, рынку энерганосьбітаў. «Гэта моцна ўдарыла па сусветнай эканоміцы, усё больш балюча адбіваецца на сацыяльна-эканамічным становішчы ў краінах, кола якіх пашыраецца, не кажучы аб тым, што бумеранг б'е па саміх ініцыятарах гэтых дзеянняў», — заўважыў Чжан Мін.

Адзін з прыкладаў — санкцыі Еўрапейскага саюза і ЗША ў адносінах да Беларусі, буйнога экспарцёра калію, які з'яўляецца ключавым кампанентам мінеральных угнаенняў. «Беларусь прадстаўляе 20 працэнтаў сусветнай вытворчасці калію, таму відавочна, што яна з'яўляецца важным пастаўшчыком. Калі гэты аб'ём не будзе пастаўляцца з Беларусі, то я не бачу нікога, хто б быў гатовы яго павялічыць», — адзначыў The Wall Street Journal Свейн Торы Холсетэр, генеральны дырэктар нарвежскай кампаніі Yara International ASA, якая з'яўляецца адным з найбуйнейшых у свеце вытворцаў угнаенняў.

Галіновыя эксперты адзначаюць, што вытворчасць угнаенняў у Еўропе, верагодна, будзе абмежавана, пакуль цэны на прыродны газ там застаюцца высокімі. Дэфіцыт угнаенняў таксама ўзмацніецца гандлёвымі абмежаваннямі ў адносінах да буйных пастаўшчыкоў.

### РЭАКЦЫЯ ФЕРМЕРАЎ

Аб праблеме высокіх цэн на ўгнаенні ўжо гавораць аграрыі па ўсім свеце: ад фермераў у Паўднёвай Амерыцы, якія вырошчваюць авакада, кукурузу і каву, да ўладальнікаў плантацый какосаў і алейных пальм у Паўднёва-Усходняй Азіі. «Фермы цэпяць няўдачу», — сказаў The Wall Street Journal 61-гадовы Радрыга Ф'ера, які вырошчвае авакада, мандарыны і апельсіны на сваёй ферме ў Цэнтральнай Калумбіі. Паводле яго слоў, за апошнія месяцы цэны на ўгнаенні падвоіліся. Фаўстын Лохуры Бітра, які вырошчвае насенне кукурузы, рысу і соі ў Кот-д'Івуары, заявіў, што, калі цэны на ўгнаенні застануцца высокія, яму давядзецца скараціць уласныя пасевы ўдвая ці больш. Ён не можа бясконца падымаць цэны на насенне, паколькі мясцовыя фермеры проста не змогуць за іх плаціць. «Калі я кажу ім, што цана насення складае тры долары за кілаграм, яны плачуць», — сказаў Фаўстын Лахуры Бітра.

Фермеры ў ЗША таксама адчуваюць цяжкасці з пакупкай угнаенняў, некаторыя з іх вымушаны змяняць тэрміны пасадкі сельгаскультур. Чакаецца, што наступствы будуць яшчэ горшыя для фермераў з краін, якія развіваюцца, дзе дробныя землеўладальнікі маюць абмежаваны доступ да банкаўскіх крэдытаў і не могуць плаціць напрамую за дарагія ўгнаенні.

Рост цэн робіць вырошчванне сельскагаспадарчых культур больш дарагім, і фермеры ў сітуацыі, якая склалася, вымушаны скарачаць вытворчасць. Сусветныя цэны на прадукты харчавання ў мінулым годзе ўжо выраслі да дзесяцігадовага максімуму. На думку спецыялістаў, скарачэнне вытворчасці яшчэ больш паўплывае на сёлетні рост цэн. Такая сітуацыя пагоршыць праблему голаду, што ўжо вострa стаіць у некаторых частках свету з-за страты працоўных месцаў у сувязі з пандэміяй, а таксама паскорыць інфляцыю.

Тым часам прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у эфіры радыёстанцыі France Bleu заявіў аб магчымым увядзенні чэкаў на прадукты. У Германіі цэны на шэраг прадуктаў харчавання і іншыя тавары рэзка выраслі ў параўнанні са студзенем гэтага года. У большасці выпадкаў скачок складае да нябачаных дагэтуль 50 працэнтаў, паведамляе нямецкі часопіс Focus. Іспанія сутыкнулася з сур'ёзнымі перабоямі паставак прадуктаў і матэрыялаў ва ўсіх сферах эканомікі з-за забастоўкі перавозчыкаў, якая праходзіць пяты дзень, паведаміла газета La Razon. У супермаркетах пустыя паліцы: няма малака, сланечнікавага алею, гародніны і садавіны, рыбы, мукі і рысу. Уладальнікі крам не ведаюць, калі змогуць папоўніць запасы неабходных прадуктаў. У Вялікабрытаніі інфляцыя па выніках лютага паскорылася да 6,2 працэнта, што стала рэкордам за апошнія 30 гадоў, паведаміла «Бі-бі-сі». Адным словам — зубы на паліцу.

**Захар БУРАК.**

**Даслоўна**

## «ЗБОЖЖА СЁННЯ — НОВАЕ ЗОЛАТА АБО НАФТА»

Пасяўная кампанія для Беларусі сёлета важная як ніколі. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях гатоўнасці да правядзення веснавых палявых работ.

«Мы праводзім яе на фоне гарачага канфлікту каля нашых паўднёвых граніц, а таксама ва ўмовах вялікага санкцыйнага ціску на Расію як галоўны рынак нашай краіны і нашага галоўнага саюзніка, пастаўшчыка сыравіны ў тым ліку, беспрэцэдэнтнага росту цэн ва ўсім свеце на вуглевадароды, угнаенні і прадукты харчавання. Акрамя таго, усталявалася засушлівае надвор'е, якое ўскладняе пачатак кампаніі», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Збожжа сёння — практычна новае золата або нафта. Можа, нават будзе даражэйшым. І паколькі адзін з асноўных сусветных пастаўшчыкоў — Украіна — наўрад ці зможа правесці паўнацэнную пасяўную кампанію, цэны будуць расці і далей», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. У самых бедных краінах планеты ААН ужо прагназуе голад.

На коне цяпер перш за ўсё ўласная харчовая бяспека Беларусі, падкрэсліў Прэзідэнт. «Мы павінны забяспечыць усім неабходным беларускі народ. Свой мы, як і заўсёды, забяспечым айчыннымі прадуктамі. Ну, і галоўнае — стварыць стабілізацыйныя фонды. У Беларусі ёсць для гэтага абсалютна ўсё: ворныя землі, айчынныя ўгнаенні, селекцыйнае насенне, сельскагаспадарчая тэхніка (не проста ёсць, мы яе вырабляем, увесь шлейф), сучасныя перапрацоўчыя заводы — самыя лепшыя, людзі ўмеюць працаваць», — заявіў беларускі лідар.

# ЛІТАРАТУРНЫ

## Якія задачы стаяць перад пісьменнікамі

**VIII Сімпозіум «Пісьменнік і час», які ладзіўся ў межах XXIX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, сабраў літаратараў розных краін для таго, каб яны змаглі абмеркаваць пытанні, звязаныя з развіццём не толькі літаратуры, але і грамадства.**

— У Рэспубліцы Беларусь склалася добрая традыцыя ў арганізацыі такога шэрагу мерапрыемстваў, не вузка спецыялізаваных, накіраваных выключна на дзейнасць пісьменніцкага асяроддзя, выдавецкага і распаўсюджвальнікаў, — заўважыў **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ.** — Важна разумець, якая роля пісьменніцкага слова ў грамадска-палітычных, эканамічных, сацыяльных працэсах. Абмеркаванне гэтых тэм мае каласальнае значэнне, і, магчыма, не толькі, і не столькі для Рэспублікі Беларусь.

На думку намесніка міністра, сёння вырашаецца будучыня ўсёй планеты. Перааасэнсоўваюцца падыходы да эканамічнага, палітычнага і нават гендарнага ўкладу, вызначаецца, як будзе наладжвацца камунікацыя паміж людзьмі і народамі. І Беларусь стала адной з пляцовак, дзе вядзецца барацьба за сэнсы, ідэалы, каштоўнасці. У такіх умовах значна ўзрастае роля асоб, якія могуць уплываць на фарміраванне грамадскай думкі, — пісьменнікаў, прадстаўнікоў культуры і мастацтва. Адпаведна ўзрастае цана ўжо не дакладных навук, а ідэй і думак. Кожнае слова, кожная кніга — на вагу золата. Літаратурныя, творчыя здабыткі будуць садзейнічаюць перамогам на больш маштабных узроўнях.

### Пошук каштоўнасцяў

Складаны, шматгалосны, халодны, абыякавы лічбавы свет пачаў даваць збоі.

— Нікога не трэба пераконваць, што часы наступілі цяжкія, і гэта прымушае задумацца пра многае. Натуральна, што ўсе мы за мір, гэта безумоўная каштоўнасць. Але якім ён павінен быць? Калі сітуацыя накалілася да такой ступені, што ваенныя канфлікты адбываюцца даволі працяглы час, значыць, свет не ўладкаваны добрым чынам. І трэба шукаць вакцыну ад нянавісці, — заўважыў **рэдактар расійскай «Литературной газеты» Максім ЗАМШАЎ.**



Адна з прычын, відаць, у тым, што свет стаў паступова забываць аб ролі пісьменніка. Адукаваныя і начытаныя людзі сёння не ў модзе, усю ўвагу адцягваюць асобы, якія ведаюць, як сябе эфектна падаць. Пошласць, мяшчанства, абмежаванасць думкі, эйфарыя вакол «лайкаў» — вось яны, пабочныя эфекты ад віртуальных хвароб сучаснага грамадства. На думку Максіма Замшава, тое, што сёння ўся гэтая драбяза паступова, хірургічным шляхам выдаляецца, — добры шанц для нашага грамадства перабудавацца. Зрухі, якія зараз адбываюцца з людзьмі, страшныя, але лячэнне ніколі не бывае лёгкім і прыемным. І тое, што ў такі няпросты час у Мінску сабраліся на маштабным форуме прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Казахстана, Кітая і іншых краін, сведчыць, што пісьменнікі спрабуюць намацаць шлях развіцця цывілізацыі без гэтага вар'яцкага глабалісцкага спажывання Захаду, без абсалютнай улады матэрыяльных інтарэсаў.

Не абышоўся сімпозіум і без прыемных сюрпрызаў. На ім прысутнічаў **чатырохразовы алімпійскі чэмпіён Аляксандр ЦІХАНАЎ.** Спартсмен доўгі час жыве ў Беларусі, а сваім багатым жыццёвым досведам дзеліцца праз кнігі. Нядаўна ён быў прыняты ў члены Саюза пісьменнікаў Расіі і сваё пасведчанне атрымаў менавіта ў час сімпозіума *(на фота).*

— З тымі нетрамі, прыроднымі рэсурсамі, багаццямі, працавітасцю народа Беларусі і Расіі мы пераадолеем любыя перашкоды. А кніга была, ёсць і будзе нашым галоўным праваднікам, — упэўнены Аляксандр Ціханаў.

**Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхаіл ПАЗНЯКОЎ** упэўнены, што аўтары павінны раскрываць праўду часу:

— Мы не проста пісьменнікі — мы знаходзімся на літаратурным фронце. Калі зайсці ў інтэрнэт, там выкладзена столькі хлусні, фэйкаў, відаць, што і асобныя пісьменнікі не разумеюць, што насамрэч адбываецца. Людзі зыходзяць з прыватных інтарэсаў, а тут трэба бачыць большае.

### Патрыятызм у словах і ў справах

Грамадзянская і мастацкая адказнасць пісьменніка перад чытачом, гістарычная памяць — аснова выхавання грамадства, сіла мастацкага слова ў развіцці патрыятычнага мыслення чытача, выбар творчых рашэнняў у пошуках мастацкай і жыццёвай праўды — вось тыя тэмы, якія абмяркоўвалі ўдзельнікі форуму.

**Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена СТЭЛЬМАХ** закранула пытанні, звязаныя з патрыятычным выхаваннем. Правядзенне ўрокаў мужнасці сучаснымі літаратарамі стала ўжо добрай традыцыяй. Кожны месяц на такія сустрэчы прыходзяць школьнікі і студэнты. Часам маладыя людзі завісаюць у мабільніках, смяюцца і, здаецца, не надта разумеюць, куды іх запрасілі. Але як яны мяняюцца пасля такіх сустрэч!

— Мы — старэйшае пакаленне, якое вырастала побач з ветэранамі. У нас склалася патрыятычнае выхаванне на самым высокім узроўні. Але мне падаецца, што мы сябе заспакоілі тым, што самі ведаем, што такое Вялікая Айчынная вайна, якая яе цана, а з моладдзю аб вайне, аб патрыятызме трэба гаварыць больш, глыбей, для іх гэта вельмі патрэбна, — заўважыла пісьменніца.

Сярод беларускіх аўтараў, якія ўзнялі на новы ўзровень у літаратуры тэму краязнаўства, радзімазнаўства — старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч. І сёння розныя сакрэты сваёй Бацькаўшчыны раскрываюць аўтары, якія жывуць у розных кутках нашай краіны, некаторыя чаруюць над кнігамі ў глыбінцы, ведаюць свае вытокі і адкрываюць унікальныя веды, якія дапамагаюць лепш зразумець у тым ліку і тое, наколькі непаўторная і захапляльная наша краіна, і такім чынам спрыяюць выхаванню патрыятызму. І гэты кірунак работы Саюза пісьменнікаў і ў Год гістарычнай памяці і надалей будзе адным з галоўных.



### Абмен ведамі

**Святлана АНАНЬЕВА, кандыдат філалагічных навук, загадчыца аддзела міжнародных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтваў імя Мухтара Аўэзава Міністэрства навукі і адукацыі Рэспублікі Казахстан,** пачала сваё выступленне з прэзентацыі калектыўнай манаграфіі «Духоўныя каштоўнасці як аснова падмурка культуры народаў», аўтары якой гавораць пра тое, наколькі вялікая роля мовы і мастацкага тэксту ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці, мадэлі нацыянальнага мыслення, этнічнасці і этнакультурнай ідэнтычнасці.

— Мы можам казаць аб канцэпце памяці, аб яго важнасці, аб культуры забыцця ці незабыцця, аб тым, як важна перадаць падрастаючаму пакаленню нашы агульныя маральныя, гуманістычныя каштоўнасці, — заўважыла выступоўца.

Сёння пісьменнікі вельмі многа робяць для таго, каб наладзіць паміж сваімі краінамі абмен культурнымі здабыткамі. Мастацкае слова іншых краін узбагачае, прыўносіць новыя веды, адкрыцці, думкі, дапамагае народам лепш разумець адзін аднаго. Вопыт і перспектывы супрацоўніцтва ў галіне гуманітарных навук, міжнароднага супрацоўніцтва, перакладной і выдавецкай палітыкі Казахстана і Беларусі ў першую чвэрць XXI стагоддзя могуць быць безумоўна распаўсюджаны на ўсе краіны СНД, паколькі дэманструюць паспяховую дынаміку аднаўлення і ўмацавання літаратурных і творчых сувязяў, папулярызацыі класічнай і сучаснай літаратур.

За апошні час у Мінску наладжаны выпуск розных альманахаў на беларускай і рускай мовах, дзе былі пададзены пераклады класічных твораў і твораў сучасных пісьменнікаў Расіі, Узбекістана, Таджыкістана, Кітая. Многія пераклады былі здзейснены з мовы арыгінала, у тым ліку на беларускую мову.

### Работа з пачаткоўцамі

**Старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Башкартаста-**



# ПРЫГАЖУНЯ ПРАЧЫНАЕЦЦА...

**Сёння і заўтра ў Вялікім тэатры оперы і балета прэм'ера — балет «Спячая прыгажуня» ў пастаноўцы маэстра Елізар'ева. Наш карэспандэнт пабываў на генеральнай рэпетыцыі напярэдадні прэм'еры і сфатаграфаваў самыя яркія моманты прагону. «Гэтая пастаноўка будзе па-сапраўднаму ўзнёслай і вытанчанай. І, вядома, іншай: усё ж за гэтыя гады і я змяніўся. Спадзяюся, гледачы ўбачаць погляд харэографа XXI стагоддзя», — расказаў Валянцін Елізар'еў.**

**Фота Віктара ДРАЧОВА.**



# ФРОНТ XXI стагоддзя?

**на Закі АЛІБАЕЎ** запэўніў, што творы беларускай літаратуры вывучаюцца ў мясцовых школах, у сваю чаргу творы аўтараў з Башкартастана трапляюць у беларускія выданні.

Каб прыцягнуць у літаратуру маладых аўтараў, у рэгіёне выпускаюцца кнігі з серыі «Маладыя галасы», у раёнах ладзяцца семінары, на якія запрашаецца творчая моладзь.

**Пісьменнік і публіцыст старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў Расіі Мікалай ІВАНОЎ** заўважыў, што сёння няма праблем з тым, каб выдаць кнігу. Былі б толькі сродкі. Часам такія аўтары друкуюцца, проста каб задаволіць уласныя амбіцыі. Як вынік — у сучасным патоку вельмі складана адсеяць сапраўдную літаратуру. Расійскі саюз пісьменнікаў знайшоў адно з выйсцяў з такой сітуацыі. Права стаць членам арганізацыі ёсць у аўтараў, чые творы друкуюцца ў часопісах, якія адносяцца да Саюза пісьменнікаў. А змясціць твор у часопісе не так проста — з-за дэфіцыту плошчаў і строгага адбору. Дарэчы, такая магчымасць справакавала цікавасць аўтараў да часопісаў, у сваю чаргу супрацоўнікі СМІ атрымалі большы выбар твораў. Важна перабудоўваць і работу выдавецтваў, якія гоняцца за хуткім, кароткім рублём і ставяць на паток скандальныя творы маладых несправактыкаваных аўтараў. Часам гэта кіламетры кніг на нейкія папулярныя тэмы, але вельмі далёкія ад сапраўднай літаратуры. Сёння трэба ладзіць семінары з пачаткоўцамі, вучыць іх, як пісаць правільна, як будаваць кнігу, і толькі пасля ўжо друкаваць.

## Дастукацца да чытача

**Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК** звярнуў увагу, што моладзь не ведае ні сучасных аўтараў, ні іх папярэднікаў:

— Калі мы гаворым пра вялікую, добрую, таленавітую літаратуру, увесь час як бы абапіраемся на нашых класікаў, на савецкую літаратуру. Сапраўды, гэтыя аўтары зрабілі многа, але на змену ім ужо прыйшлі новыя цудоўныя пісьменнікі. І сёння трэба шукаць, як зрабіць, каб гэта годная змена стала побач.

На змену класіцы прыйшла бульварная літаратура, інтэрнэт. Сёння маладыя людзі чытаюць, глядзяць і слухаюць зусім іншае, жахлівай якасці. Таму ў сучасных празаікаў, паэтаў задача дагрукацца да сэрцаў чытачоў, асабліва маладых, намнога складанейшая, чым была ў папярэднікаў. Некалі своеасаблівым праваднікам у свет добрай літаратуры былі часопісы. Напрыклад, тыя ж «Нёман» і «Сучаснік». Магчыма, трэба вярнуць ім былую славу.

**Доктар філалагічных навук, вядомы літаратуразнаўца з Казахстана Бейбут МАМРАЕЎ** прапанаваў гаварыць не толькі аб літаратурных пытаннях, але і аб праблемах усяго грамадства, калі трэба больш увагі ўдзяляць ідэям гуманізму, аб'яднання народаў, і ў гэтай карэннай змене светапогляду чалавека вялікая роля належыць мастаку, пісьменніку, слову.

Зусім не важна, у якой частцы свету народзіцца той ці іншы мастак, які зможа адчуць рэчаіснасць і так яе апісаць, што гэта стане адкрыццём. На гэта звяртаў увагу яшчэ Чынгіз Айтматаў у XX стагоддзі. Але мы ўжо пражылі два дзесяцігоддзі ў XXI стагоддзі, і трэба нарэшце вызначыцца з далейшым. І тут стаіць пытанне пра гістарычную памяць як аснову грамадства, бо без яе мы ўсе асуджаныя жыць толькі сённяшнім днём. Працэс вяртання гістарычнай памяці няпросты, хваравіты. На пісьменніку ляжыць вялікая адказнасць. Ён павінен абапірацца на навуку, на архівы, на крыніцазнаўства. А чытачу варта раздзяляць паняцці гістарычнай праўды і мастацкай, і тут узнімаецца пытанне аб літаратурнай навуцы, літаратурнай крытыцы, літаратуразнаўстве.

— Сёння мы дастаткова ведаем вяршыні сваіх уласных культур, імёны класікаў. Але свет ужо іншы, і ёсць электронныя магчымасці, і ніхто не перашкаджае нам стаяць разам і глядзець у адным напрамку, — заўважыў Бейбут Мамраеў, звярнуўшы ўвагу на неабходнасць развіцця перакладаў, ажыўлення творчых кантактаў, чытання лекцый пісьменнікамі. — Гэта будзе садзейнічаць у цэлым развіццю агульначалавечых каштоўнасцяў. Думаю, культура — самы сапраўдны базіс, і вытокі яе ў адукацыі, сямейным выхаванні, у павазе да любога чалавека, які можа знаходзіцца побач.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш

# ЖЫВАЯ ГІСТОРЫЯ І ДАПОЎНЕНАЯ РЭАЛЬНАСЦЬ

## Цікавосткі XXIX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу

Калі ўваходзіш у выставачны цэнтр, дзе праходзіць XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш, крыху губляешся ад стракатага відовішча мноства павільёнаў беларускіх і замежных выдавецтваў: куды пайсці найперш? Складана не заўважыць галоўную сцэну, дзе адбываюцца прэзентацыі кніг і творчыя сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі. Стэнд галоўнай сцэны ўпрыгожаны надпісамі, якія нагадваюць аб сёлетніх знакавых для беларускай літаратуры датах — 100-годдзі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і 50-годдзі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Таксама тут размясцілі фотаздымкі і паштоўкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя, якія расказваюць пра багаты архітэктурны скарб нашай краіны. Гэта гісторыя, якая ажыла. І выраз далёка не фігуральны: з фота можна ўзаемадзейнічаць у рэжыме дапоўненай рэальнасці. Усё, што трэба зрабіць, — навесці смартфон на здымак і падзівіцца таму, як ён ажывае праз экран. На стэндзе Міністэрства інфармацыі мне распавялі, што гэта праект **гісторыка і калекцыянера Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА,** прымеркаваны да Года гістарычнай памяці. Аўтар вырашыў захаваць наш культурны код адразу ў двух вымярэннях — папяровым і лічбавым. Набыць такую цікавую рэч можа кожны, на выстаўцы-кірмашы прадаюцца календары «Бацькаўшчына», адпаведна, з імі таксама можна гуляцца ў рэжыме дапоўненай рэальнасці.

Уладзімір Ліхадзедаў распавёў «Звяздзе» аб яшчэ адным цікавым выданні, якое выйшла сумесна з «ААБ Беларусбанк» і прымеркавана да яго 100-годдзя:

— У кнізе «Банкі Беларусі» сабрана больш за 330 старых фотаздымкаў, якія адлюстроўваюць банкаўскую сістэму, што існавала на тэрыторыі Беларусі да 1917 года. Там распавядаецца аб ашчадных касах, якія знаходзіліся пры кожных чыгунчаных касах і параходных прыстанях. Аб гэтым практычна ніхто не ведае. Гартаючы старонкі, ты пачынаеш разумець, што нашы землі былі не проста адсталай ускраінай, а сапраўды цэнтрам і культурнага, і фінансавага жыцця.



Падчас прэзентацыі выдання **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ** адзначыў:

— Гэты праект — вынік сумеснай, найскладанейшай працы як уласных ініцыятыў, так і «АСБ Беларусбанк». Па-першае, неабходна было сабраць калекцыю ўнікальных здымкаў, па-другое, скласці цікавы расповед, абапіраючыся на дакументальныя хронікі. Гэтае выданне захоўвае культуру нашага народа.

Шмат на выстаўцы згадак і пра яшчэ дзве знакавыя даты — 140-годдзе Янкі Купалы і Якуба Коласа. Гэтай падзеі прысвяцілі многае: ад факсімільных выданняў да квэстаў.

Працягваючы знаёміцца з экспазіцыяй выстаўкі-кірмашу, я заўважыла стэнд, дзе амаль няма кніг, але заўсёды шмат людзей. Гэта павільён Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка — установы адукацыі, якая падтрымлівае цікавасць дзяцей да навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці. Дзіцячы тэхнапарк нават праводзіць адукацыйныя змены: некалькі тыдняў навучэнцы школ праводзяць разам з выкладчыкамі вышэйшых устаноў, распрацоўваючы цікавы праект. Увагу наведвальнікаў прыцягнуў робат Роберт: каб зрабіць з ім фотаздымак, выстраілася чарга.

Не спынялася актыўнасць і на пляцоўцы Саюза пісьменнікаў Беларусі. Увесь час, што я знаходзілася ў «БелЭкспа», адтуль гучалі вершы і песні. Мікола Чарняўскі прэзентаваў кнігу «Вяселле ў Налібоках», а Кастусь Цыбульскі правёў музычна-паэтычную імпрэзу «Я застаюся тут». Для маленькіх наведвальнікаў Саюз пісьменнікаў Беларусі прапанаваў інтэрактыўную аўтограф-сесію Сяргея Клімковіча і яго кнігі «Прыколы из школы».

Выдавецкі дом «Звязда» таксама быў у цэнтры ўвагі, з найбольш яскравага — прэзентацыі кніг дзіцячай пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой. Аўтарка ўмее распавядаць дзеткам так, каб яны слухалі, бо сама працуе настаўніцай. На сёлетняй выстаўцы-кірмашы яна пазнаёміла наведвальнікаў са сваёй новай казачнай кнігай «Сакрэты аднаго каралеўства».

На 27 сакавіка на нашым стэндзе запланавана сустрэча з Валянцінам Елізар'евым. Кніга «Феномен Валянціна Елізар'ева» ўбачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» і па-новаму раскрывае асобу знакамітага на ўвесь свет беларускага харэографа. На старонках новага выдання — вялікая колькасць фатаграфій як самога Елізар'ева, так і сцэн з яго спектакляў, а таксама інтэрв'ю з самім харэографам і са знакамітымі артыстамі балета, кампазітарамі, балетмайстрамі. Кнігу можна будзе набыць і ўзяць аўтограф у яе галоўнага героя. Наперадзе нас чакае яшчэ шмат мерапрыемстваў. Цырымонія закрыцця адбудзецца ў нядзелю, 27 сакавіка, а 15.00.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**





## Извещение о проведении **13 апреля 2022 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

| Сведения о продаваемом имуществе | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Сведения о земельном участке | Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| Капитальное строение с инвентарным номером 420/С-27097 общей площадью 89,3 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Гончарский с/с, д. Селец, ул. Молодежная, 11А, наименование – магазин № 60, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: пристройка (Б1/к), три склада (2, 3, 4), уборная (5), два забора (а, б) | Площадь – 0,1052 га, кадастровый номер – 423682707164000024 | 7 680,00 | 768,00 |
| **Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, техническим характеристикам и комплектации, рекомендуется осмотр** | | | |

**Продавец имущества:** ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условия торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» р/с BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 13.04.2022.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **13 апреля 2022 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 28.03.2022 по 11.04.2022** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»).

Дополнительная информация размещена на сайте **www.mgcn.by** в разделе «Недвижимость в собственность».

## Информация о проведении аукциона **29 апреля 2022 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в **аг. Барсуки, дер. Жажелка** Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

Организатор аукциона: Жодинский сельский исполнительный комитет, 222161, г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **аг. Барсуки** | 624881701101000471 | 0,0914 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 16 000,00 |
| 2 | **дер. Жажелка** | 624881705601000179 | 0,15 га | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки) | 8 000,00 |

**Аукцион состоится 29 апреля 2022 г. в 10.00 в Жодинском сельском исполнительном комитете по адресу: г. Жодино, пер. Молодежный, д. 3, кабинет № 1.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу: **https://au.nca.by**, Смолевичского райисполкома: **http://www.smolevichi.gov.by.**

УНП 600023532

